# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 06 (2804) Год LV | Беласток, 7 лютага 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)


# Жывая гміна Нарва

Дзіцячы калектыў з Нарваўскага асяродка культуры займальна калядаваў пад акампанемент Магдалены Уладарчык і Алега Кабзара

Справа: Эвеліна Келбашэўская, Юліта Кананюк і Анна Келбашэўская

**— Мы ладзім чарговыя сустрэчы перад усім дзеля дзетак і моладзі, каб не забылі яны традыцый сваіх бацькоў і дзядоў, — заявіла дырэктар Нарваўскага асяродка культуры Тамара Юшкевіч. VI выпуск праекта „Жыве яшчэ традыцыя", наладжаны 29 студзеня ў Епархіяльным асяродку праваслаўнай культуры ў Крыўцы, прыцягнуў, нягледзячы на халоднае і ветранае зімовае надвор'е, людзей з навакольных вёсак. Сярод запрошаных гасцей былі святары з прыходаў Нарваўскай гміны, некаторыя радныя і чыноўнікі гмінных устаноў. Аднак галоўнымі героямі мерапрыемства сталі вучні, якія выступілі з сучаснымі і традыцыйнымі калядкамі — важнай часткай зімовага фальклору. Публіку моцна зацікавілі таксама гумарыстычныя сцэнкі і жартоўныя дыялогі вядучых мерапрыемства.**

— Мы спачатку займаліся ў тэатральным гуртку ў Ласінцы, які вяла інструктар НАК Паўліна Пашко, а тэксты тады пісала нам былая бібліятэкарка з Ласінкі Ала Станько. Цяпер мы самі пішам тэксты, а пасля дапрацоўваем іх разам з Тамарай Юшкевіч, — сказалі Юліта Кананюк з Кавелы і Эвеліна Келбашэўская з Гарадзіска, якія адважна вялі мерапрыемства і выступалі з жартоўнымі сцэнкамі на мясцовай гаворцы. Выдатнай вядучай і акцёркай аказалася таксама Аня Келбашэўская з Гарадзіска, вядомая з выступаў на мясцовых мерапрыемствах і на беларускіх школьных імпрэзах. Частка кароценькіх сцэнак тычылася зімовага перыяду і калядавання. Дзяўчаты ўспаміналі, між іншым, пра чэргі калядоўшчыкаў да старшыні ўправы фірмы „Пронар" Сяргея Мартынюка.

— Дзяўчаты праўду гаварылі, бо мае хлопцы пайшлі калядаваць да старшыні Сяргея Мартынюка пасля восьмай гадзіны вечара і яшчэ мусілі стаяць у чарзе, якая доўжылася цэлы дзень. Сюды прыехалі калядаваць не толькі вучні з навакольных сёл, але і моладзь з больш адлеглых мясцовасцей. Нават аўтобус з калядніками з Гайнаўкі быў, — пацвердзіла словы выступаючых дырэктар Тамара Юшкевіч. — Спадар Мартынюк цярпліва прымае ўсіх калядніка і шчодра іх абдароўвае.

Вучні, прыбылыя на праслаўленне Хрыстовага Нараджэння ў Крывец, таксама мусілі выстойваць у чарзе, покі былі запрошаны на сцэну. Першымі калядавалі наймалодшыя дзеткі з падставовых школ, што прыехалі з розных мясцовасцей. Пасля перад публіку выходзілі штораз старэйшыя вучні, а некаторыя выступы суправаджаліся музычнымі інструментамі. Асаблівым калядаваннем вылучаўся дзіцячы калектыў Нарваўскага асяродка культуры. Гэтыя вучні займальна спявалі пад акампанемент свайго апекуна Магдалены Уладарчык і самога Алега Кабзара, які час ад часу прыязджае ў Нарву і дапамагае рыхтаваць мясцовых дзетак. Удала запрэзентаваўся таксама калектыў „Зараначка" з Ласінкі, які выконваў калядкі на манер царкоўнага спеву. З 2008 года кіруе ім Марыя Бубка. Трэба сказаць, што ўсе выступленні ў Крыўцы былі на свой спосаб займальнымі, а паасобныя калядоўшчыкі атрымлівалі падарункі. Дзедам Марозам стаў таксама войт Нарваўскай гміны Якуб Садоўскі, які ўручыў падарункі акцёрам, што выступілі ў тэатральных сцэнках.

— Вы „чудакі", — заявіў жартоўна войт Якуб Садоўскі, даючы акцёрам і заадно вядучым Юліце Кананюк, Эвеліне і Анне Келбашэўскім падарункі. — Школа адукуе і выхоўвае, а задача Нарваўскага асяродка культуры і Гміннай бібліятэкі гэта між іншым вышукваць і дапамагаць развіваць таленты нашых дзетак і моладзі. У час такіх, як сённяшняе, мерапрыемстваў вучні маюць добрую нагоду асвойвацца з публікай і здабываць сцэнічны вопыт.

Войт Садоўскі пахваліў усіх вучняў, называючы іх выступленні цудоўнымі. Многа цёплых слоў накіраваў таксама ў адрас дырэктар НАК Тамары Юшкевіч за яе ангажаванасць у прэзентаванне мясцовых абрадаў, гульняў і спеваў у рамках праекта „Жыве яшчэ традыцыя". Нарваўскі асяродак культуры здаўна рабіў многа ў карысць беларускай культуры і заадно з думкай пра мясцовае насельніцтва, хаця б арганізуючы гмінныя агляды дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова" і іншыя мерапрыемствы з удзелам дзетак і моладзі пад наглядам настаўніцы беларускай мовы Ніны Абрамюк. Аднак, калі дырэктарам асяродка стала Тамара Юшкевіч беларускае слова і беларускія песні сталі яшчэ больш частымі ў вёсках Нарваўскай гміны. Адным з самых зручных месцаў на Нарваўскай зямлі, дзе можна ўдала арганізаваць большыя мерапрыемствы, з'яўляецца Асяродак праваслаўнай культуры ў Крыўцы, які цяпер масава наведваюць не толькі жыхары сваёй гміны. За малітвамі і парадамі прыязджаюць сюды на спатканні з архімандрытам Гаўрыілам жыхары Гайнаўшчыны, Бельшчыны і іншых куткоў Беласточчыны. У выбраныя дні можна пачуць тут супольную малітву, чытаюцца акафісты, прэзентуюцца фільмы з духоўным зместам і вядуцца бяседы. Праваслаўныя мерапрыемствы пераплятаюцца ў Крыўцы з прэзентацыяй нашага фальклору, а таксама народных абрадаў і сцэнак на беларускай літаратурнай мове.

**Тэкст і фота Аляксея Мароза**


Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Бельск-Падляшскі • Сямятычы • Беласток

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com


**Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку**

**Універсітэт у Беластоку**

**Гродзенскі ўніверсітэт ім. Янкі Купалы**

**ЗАПРАШАЮЦЬ**

**на вечар памяці**

***Чэслава Немэна,***

**які адбудзецца 10 лютага 2010 г. а гадз. 17.00 у актавай зале Універсітэцкай бібліятэкі імя Ежы Гедройца (вул. М. Складоўскай-Кюры, 14А, Беласток)**

**ПРАГРАМА:**

**— канцэрт твораў Ч. Немэна ў выкананні эстраднага аркестра „КАПРЫЗ" Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Янкі Купалы і заслужаных артыстаў Беларусі;**

**— дэманстрацыя дакументальных фільмаў пра Ч. Немэна беларускага і польскага творцаў: Веры Савінай і Эўгеніюша Шпакоўскага;**

**— дыскусія.**

# Настаўнікі і страўнікі

Таямніца чалавечых лёсаў застаецца непазнавальнай загадкай. Нехта ўваходзіць станоўча ў гісторыю цягам усяго свайго руплівага і паслядоўнага жыцця, а нехта адным яркім подзвігам. Нехта дзесяцігоддзямі тыраніць свой народ, пакідаючы за сабой чорную славу, а нехта вызначаецца ў адно імгненне ганебным адным учынкам. Мне невядома, ці чыноўніца Таісія Данілевіч сама выявіла ініцыятыву жадання хутчэй ачысціцца ад „скверны", ці яна атрымала загад „усемагутных" спецслужбаў разабрацца з іншадумцамі. Але факт застаецца фактам. Кіраўнічка Упраўлення адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Таісія Данілевіч запатрабавала ад шасцёх розных настаўнікаў выйсці з апазіцыйных дэмакратычных партый ці звольніцца з працы „па асабістым жаданні". Маўляў, такія настаўнікі не маюць права працаваць у дзяржаўных школах. Нібы тыя настаўнікі ўваходзяць у якую бандыцкую структуру ці ў падпольна-дэструктыўныя фармаванні, а не ў зарэгістраваныя Міністэрствам юстыцыі палітычныя партыі, якія працуюць абсалютна легальна. І пра які лібералізацыйны курс дзяржавы тут можна гаварыць? Але колькі жыву ў роднай Беларусі, не перастаю здзіўляцца глыбіні калабарацыянізму насельнікаў нашай краіны, гэтай лакейскай адданасці службовых асоб свайму „хозяину", хто б ім не быў.

Адзін з апальных настаўнікаў, сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Сяргей Клімёнак пастанавіў выйсці з шэрагаў сваёй партыі. Сваё няпростае рашэнне Клімёнак патлумачыў тым, што не можа ўзяць адказнасць за ўвесь калектыў. Дырэктара вельмі верагодна могуць звольніць, а школу ўвогуле зачыніць з-за недабору дзяцей. У выніку шмат педагогаў пазбавяцца працы. Не будзем тут даваць катэгарычных ацэнак гэтаму кампрамісу. Можа Сяргей Клімёнак і мае рацыю. Толькі як будзе гэты яго дырэктар глядзець у вочы сваім падначаленым, вучням старэйшых класаў? Як будзе весці выхаваўчы працэс у школе?

У гэтай сітуацыі здзіўляе не менш іншае. Чаму па ўсёй Мінскай вобласці толькі шэсць настаўнікаў уваходзяць у дэмакратычныя партыі. Чаму не шэсцьдзесят і не шэсцьсот? Мяркую, у іншых рэгіёнах сітуацыя аналагічная. Дзе ж тыя слаўныя традыцыі часоў Якуба Коласа, калі настаўнікі, змагаючыся з несправядлівасцю і дыскрымінацыяй беларусаў, збіраліся на нелегальныя з'езды, змагаліся за беларускую школу, вялі падпольную асветніцкую працу! А часы тады былі куды цяжэйшыя і складанейшыя, многія з тых настаўнікаў-асветнікаў адсядзелі ў турмах, некаторыя заплацілі жыццём за свае погляды і перакананні. Гэта была сапраўдная эліта нацыі, соль і сумленне нашай зямлі.

Сённяшнія ж нашы настаўнікі ў пераважнай бальшыні найперш дбаюць пра страўнікі. Мала таго, што яны „прыніжаныя і зняважаныя" як ніколі. Сістэма змушае іх быць у страху, жыць двайной мараллю, хлусіць сваім выхаванцам. Колькі гадоў таму адна знаёмая настаўніца расказвала іншым пра тое, як яе ўключылі ў склад участковай камісіі. Яна эмацыйна гаварыла як пасля дня выбараў ледзь не тыдзень сядзела ў ванне, каб адмыцца ад таго бруду, які ўбачыла падчас працы камісіі. Але ж, як у тым анекдоце: спярша моцна балела, а потым неяк прыцярпелася. І напэўна далей уваходзіць у тыя камісіі, што робяць сваю чорную справу з „выбараў" у „выбары". У сучасных беларускіх рэаліях настаўнікі складаюць ці не бальшыню саставу ўчастковых камісій, якія здзяйсняюць маштабныя фальсіфікацыі. Як могуць такія людзі вучыць дзяцей? Пра якую духоўнасць могуць яны гаварыць? І якая будучыня ў такой нацыі?

Пра дзікі выпадак з паставай чыноўніцы аддзела адукацыі піша зараз незалежная прэса, б'юць у званы праваабаронцы. Але самі настаўнікі, калегі тых, каго несправядліва пераследуюць, выяўляюць альбо абыякавасць, альбо страх умешвацца ў сітуацыю. Нідзе не прачытаў, каб хоць хто з іх выказаўся з нагоды абсурднай, незаконнай і амаральнай заявы чыноўніцы, што страціла пачуццё меры, годнасці і сораму. Анідзе не пачуў, каб хоць адзін з шасці дырэктараў паспрабаваў адбараніць прадстаўніка свайго калектыву...

І як мы можам чакаць перамен да лепшага?

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Паміж Беларуссю і Польшчай




Беларускага драматурга Сяргея Кавалёва ведаю яшчэ з пачатку 1980-х гадоў. Мы — аднакурснікі, разам вучыліся на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта. Тады светларусы юнак з Магілёва спрабаваў пісаць вершы. Некаторыя нават публікаваў у студэнцкім друку, калектыўных зборніках. Потым зарэкамендаваў сябе як крытык, выдаў некалькі кніг літаратурна-крытычных артыкулаў, прысвечаных праблемам беларускай паэзіі 1980-х гадоў, узаемаадносінам мастацкай літаратуры і крытыкі.

Пасля крытыкі Сяргей Кавалёў перайшоў на казкі, выдаў кніжачку казак „Мэва". А з казак — ступіў на сцяжыну драматургіі. І гэтая сцяжына аказалася самай плённай і ўдачнай. Па ёй Сяргей Кавалёў вось ужо 20 гадоў крочыць надзейна і ўпэўнена.

Да 20-годдзя творчай дзейнасці Сяргея Кавалёва як драматурга ў мінскім выдавецтве „Кнігазбор" нядаўна выйшла з друку кніга „Паміж Беларуссю і Польшчай". Адзначу, што драматург не толькі піша добрыя п'есы, якія атрымліваюць сцэнічнае жыццё ў Беларусі, Расіі, Украіне, Славакіі, а таксама ў Польшчы. Але, акрамя гэтага, Сяргей Кавалёў — доктар філалагічных навук, прафесар Люблінскага ўніверсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай. Пэўны час ён жыў паміж Мінскам і Люблінам. Пэўны час у Мінску выкладаў у Белдзяржуніверсітэце гісторыю беларускай літаратуры. Але ў 1993 годзе ў Люблінскім універсітэце адкрылі аддзяленне беларусістыкі, і Сяргея Кавалёва запрасілі туды чытаць лекцыі па гісторыі беларускай літаратуры. Як сказаў сам выкладчык, у Любліне было няшмат лекцый, таму амаль усе свае п'есы ён напісаў там. Вялікі ўплыў на яго тэатральны досвед аказалі і фестывалі, якія часта ў Любліне праводзяцца. Найперш такія фестывалі, як „Канфрантацыя" і „Суседзі". Акрамя таго, драматург паглядзеў шмат разнастайных тэатральных пастановак на сцэнах Кракава, Варшавы, Беластока. У Любліне на польскай мове ў 2004 годзе пабачыла свет яго кніга п'ес „Zmęczony diabeł". А Люблінскі тэатр імя Юльюша Астэрвы ў 1997 годзе паставіў яго п'есу „Стомлены д'ябал". Ды і асеў драматург і прафесар у Любліне, відаць, надоўга.

Кнігу „Паміж Беларуссю і Польшчай" падрыхтавалі тэатральныя крытыкі Людміла Грамыка з Беларусі і Ірына Лапо з Польшчы. Кніга прысвечана драматургіі Сяргея Кавалёва, яна, як адзначаецца ў анатацыі, дае ўнікальную магчымасць прасачыць мастацкую эвалюцыю пісьменніка, параўнаць рэцэпцыю яго творчасці на радзіме і ў краіне, з якой Сяргей Кавалёў звязаў свой лёс як выкладчык Люблінскага ўніверсітэта.

Кніга складаецца з трох частак, якія дазваляюць убачыць драматургічную творчасць Сяргея Кавалёва на Беларусі і ў Польшчы з дыяхранічнай і геапалітычнай перспектыў. У кнігу ўвайшлі рэцэнзіі на п'есы і спектаклі драматурга, гутаркі з ім, спрэчкі наконт яго п'ес, апублікаваныя раней у беларускім і польскім друку. А напісана пра п'есы даволі папулярнага на Беларусі сёння драматурга было шмат.

За 20 гадоў сваёй драматургічнай творчасці Сяргей Кавалёў напісаў больш за 20 п'ес, паводле якіх адбылося каля 100 прэм'ер. Найбольш вялікі рэзананс у польскім і беларускім друку выклікалі яго п'есы так званага герменеўтычнага праекта — „Тарас на Парнасе", „Звар'яцелы Альберт", „Стомлены д'ябал", „Трышчан ды Іжота", „Саламея", „Балада пра Бландою", „Навука кахання", „Легенда пра Машэку".

Тэксты ў кнізе надрукаваны на беларускай, рускай і польскай мовах. Аўтары іх — даволі вядомыя тэатральныя крытыкі і знаўцы сцэнічнага мастацтва ў Беларусі і ў Польшчы — Таццяна Арлова, Тамара Гаробчанка, Пятро Васючэнка, Жана Лашкевіч, Рычард Смольскі, Андрэй Курэйчык, Вольга Барабаншчыкава, Юлія Палачаніна, Фёдар Драбеня, Агнешка Баровец, Ірына Лапо, Бэата Сівэк і іншыя.

Кніга „Паміж Беларуссю і Польшчай" выйшла невялікім накладам — усяго 200 асобнікаў. Фундатарам яе з'яўляецца Польскі інстытут у Мінску.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

**Вачыма еўрапейца**

## Памяць аб стратах

Незадоўга да 65 гадавіны вызвалення гітлераўскага канцлагера ў Аўшвіц і Міжнароднага дня памяці ахвяр галакосту вядомы мастацкімі правакацыямі і вулічнымі хепенінгамі Рафал Бэтлееўскі намаляваў у Варшаве на адным з муроў агромны надпіс „Tęsknię za tobą Żydzie". Невядома чаму, шмат хто з жыхароў сталіцы ўспрыняў гэты лозунг як антысеміцкі. Зараз пасля хтосьці замаляваў слова „Żydzie". Падобныя надпісы паявіліся не толькі на вуліцах Варшавы, дзе калісь пражывалі яўрэі, але таксама і ў Тэль-Авіве, на муры адной з кавярняў з прыпіскай „Tesknię za tobą w Polsce". Калі Рафал Бэтлееўскі маляваў адзін з надпісаў у Варшаве, спыніла яго паліцыя абвінавачваючы ў... распаўсюджванні антысеміцкага зместу. Кажуць, што ў час допытаў меў пачуць: „K... tęsknisz za Żydami?! Spie... do Izraela".

У рамках іншай акцыі, якая мае ахапіць усю Польшчу (між іншым, як сказаў мне спадар Рафал, плануе яе таксама правесці ў Беластоку), мастак мае фатаграфаваць тых, якія памятаюць нежывучых ужо яўрэяў у характэрных для іх месцах з пустым крэслам. Аб сваіх акцыях Рафал Бэтлееўскі гаворыць:

— Галоўным матывам з'яўляецца маё пачуццё тугі, вынікаючае з усведамлення сабе маштабу страты. Пераломванне стэрэатыпаў цікавіць мяне толькі настолькі, наколькі ўзмацняе водгалас акцыі і проста яе грамадскі маштаб. Пішучы на сценах „Tęsknię za tobą Żydzie" не пераломваю ніякіх сваіх прадузятасцей, не выкручваю сабе рук, проста — так адчуваю. Думаю, што для свядомага паляка сінонімам слова генацыд павінна быць слова страта.

З зацікаўленнем прыглядаюся акцыям Бэтлееўскага і прыгадваюцца мне антысеміцкія надпісы на беластоцкіх (і не толькі) мурах, якіх шмат паявілася ў апошнія гады і якія па загадзе ўлад Беластока скрупулёзна замалёўваліся, а іх аўтары праследаваліся паліцыяй. І так сабе я падумаў, што антысемітызм, але і беларусафобію (мабыць, вынікаючую таксама са звычайнай смаркачоўскай дурноты) немагчыма знішчыць беганнем па горадзе з вядзерцам фарбы і пэндзлем ды пацыфікаваннем іх праяў. Акцыі Рафала Бэтлееўскага выклікаюць рэакцыю, прымушаюць задумацца — як сам казаў — над тым, што страчана і што ў Польшчы страцілася з дазволу свету. Гаворка не толькі пра генацыд яўрэяў, але з'явы (нацызм, фашызм), якія ў трыццатыя і саракавыя гады мінулага стагоддзя ахапілі Еўропу і з рознай сілай, і пад розным выглядам усё вяртаюцца. Варта, каб мы памяталі аб стратах, аб іх прычынах і паслядоўнасцях, бо, як сказаў у час святкавання апошняй гадавіны вызвалення канцлагера ў Аўшвіц яго вязень праф. Уладыслаў Барташэўскі: „Тады свет не цікавіўся нашымі пакутамі, а нават смерцю".

У гэтым кантэксце задзівіў мяне — далікатна кажучы — змест аднаго закліку, прысланага з Кракава на адрас Беларускага саюза ў РП і Беларускага аб'яднання студэнтаў. Хтось, падпісваючыся раз як магістр Барташ Рахвал, іншым разам як доктар Міхал Масялэк (на вока такі самы почырк) напісаў: „W imieniu Towarzystwa Polskiego Lwowa żądam natychmiastowego zwrotu Wilna i Lwowa jako ziem zagrabionych Polsce w 1939 r." У першы момант пасля прачытання гэтых слоў я падумаў: „Чарговы вар'ят!". Пасля, аднак, прыйшоў да высновы, што вар'яты могуць быць небяспечнымі так, як дурні. І вось па прычыне небяспекі, якую такія вар'яты і дурні могуць навесці, абедзвюма рукамі падпісваюся пад акцыямі Рафала Бэтлееўскага.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Семнаццаты фестываль

Агульнапольскі фестываль „Беларуская песня — 2010” (ягонае фестывальнае выданне XVII, а агульнае сорак першае), завяршыўся цэнтральнымі элімінацыямі 31 студзеня. На мерапрыемства, якое ў зале Гарнізоннага клуба ў Беластоку згуртавала гледачоў, гасцей ды 73 адзінкі выступоўцаў, згодна з традыцыяй арганізатараў, наша рэдакцыя не была запрошана. Са СМІ абавязкова прыстутнічалі прадстаўнікі медыйнага патранажу — Радыё Беласток і Тэлебачанне Беласток. Фінансава фестываль падтрымала МУСіА, Падляшская маршалкоўская ўправа, Управа горада Беластока і Культурны цэнтр Беларусі. Удзельнікі прадстаўлялі ўсе рэгіёны Беласточчыны, была таксама выдатная спявачка з Варшавы. Паявіліся і новыя пункты беларускай песні — Крынкі, Парцава, Нарва, Вілінава, Белавежа і Нурэц. Некаторыя гурты размножыліся, як „Калінка”. Некаторыя „вечныя” гурты не прынялі ўдзелу. Прагучалі старыя — здаўна вядомыя песні, але і новыя, на словы жывых ды прысутных на свяце аўтараў (шкада, што аўтары слоў і музыкі не ўспамінаюцца), узніклі новыя іх аранжыроўкі ці кампазіцыі. Шкада, бо прысутны быў, скажам, Віктар Швед, якога вельмі ўцешылі патрыятычная песня „За роднай партай” („Не забывай...”), якую выканала „Рэчанька” ці кампазіцыя Аліны Негярэвіч на ягоны верш „Першы снег”, якую велічна і гожа заспявалі „Куранты”. І варта ж успомніць слухачам, што аўтарам слоў песні-гімна „Мой Беластоцкі край”, што традыцыйна пачынае фестываль, з'яўляецца Алесь Барскі, сёлетні 80-гадовы юбіляр.

*Пераможцы фестывалю — лаўрэаты першых месцаў.*

Катэгорыя фальклорнай аўтэнтычнай песні. Салісты — Марыя Врублеўская (Гарадок). Дуэты, квартэты і трыо — квартэт „Жэмэрва” (Студзіводы). Вакальныя калектывы — „Жэмэрва” (Студзіводы). Хары — „Родына” (Дубяжын).

Катэгорыя апрацаванай фальклорнай песні. Вакальныя і інструментальныя калектывы — „Вэрвочкі” (Орля). Эстрадныя калектывы — „Знічка” (Гайнаўскі белліцэй). Хары — „Загадка” (Супрасль).

Сучасная беларуская песня. Салісты — Дар'я Маркевіч (Гайнаўскі белліцэй), Уладзімір Іванюк (Беласток). Вакальныя калектывы — „Куранты” (Бельск-Падляшскі), „Расспяваны Гарадок” (Гарадок). Вакальна-інструментальныя калектывы — „Маланка” (Бельск-Падляшскі). Эстрадныя калектывы — „Калінка” (Беласток). Хары — „Крыніца” (Беласток).

**Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ**

„Вэрвочкі” (Орля)

„Крыніца” (Беласток)

Хор „Загадка” (Супрасль)

Марыя Врублеўская (Гарадок)

Уладзімір Іванюк (Беласток)

Дар'я Маркевіч (Гайнаўскі белліцэй)

„Родына” (Дубяжын)

„Маланка” (Бельск-Падляшскі)

„Знічка” (Гайнаўскі белліцэй)

„Калінка” (Беласток)

## Зусім як той Сталін

З вялікай увагай прачытаў я тэкст Аляксандра Вярбіцкага „З'езд-опера" і сур'ёзна над гэтай нашай беларускай справай задумаўся. Гэта ўсё павінна балець усіх лідараў беларускіх арганізацый. На маю думку, спадар Янка Сычэўскі хоча ў Польшчы трымаць жалезнай рукой усе беларускія арганізацыі, зусім як той Сталін. Спадар Сычэўскі абвінавачвае ўсіх журналістаў, якія пішуць ці вяшчаюць пра беларускія справы, усе беларускія згуртаванні, і мне, старому беларусу, адчуваецца, што гатоў іх усіх разам утапіць у кроплі вады. Кожны цяпер робіць сваё і няма як прысабечыць іхніх поспехаў! І ўсе вінаватыя, і ўсё і ўсе варожа ставяцца да актыву заслужанай арганізацыі ды шкодзяць ёй як могуць ды не даюць развівацца і пляжаць правільную беларушчыну! А хто найбольш даклаўся да такога стану, скажам, беларускага школьніцтва? А дзякуючы каму вядзецца навучанне беларускай мовы ў Беластоку? Хто з унукаў заслужаных сейбітаў беларушчыны ў Польшчы ходзіць у беларускі садок, „чацверку", семую гімназію ці ў III ліцэй?

Прабачце, спадар Янка, што я, селянін з Бялкоў у Нарваўскай гміне, папракаю вас у характары і ў „сталінскіх" замашках. Замест спрачацца і лаяцца, падумайце, адазвіцеся да іншых беларускіх лідараў і дагаварыцеся, як паяднацца дзеля нашай супольнай справы.

## Саколка ў снезе

Давялося мне 16 студзеня пабываць у горадзе Саколцы. Была марозная раніца, калі я на легкавушцы спыніўся на стаянцы каля царквы. Усюды поўна снегу. Вуліцай у напрамку Кузніцы-Беластоцкай імчацца аўтафуры адна за адной так, што цяжка пешаходу перабрацца на другі бок. Перад 8 гадзінай раніцы спыняецца аўтобус ПКС з Беластока на прыпынку каля царквы. На тратуары насупраць царквы поўна снегу, толькі вузенькая сцяжынка пратаптана, зусім як у лесе, калі пройдзе статак дзікіх свіней. Сцежачка такая няроўная, што старэйшай асобе, да таго з кіёчкам, цяжка тудою прайсці. Такіх нерасчышчаных тратуараў бачыў я шмат у Саколцы. Ці ў гэтай будучай сталіцы малога памежнага руху ніяк не дзейнічаюць камунальныя службы? Заснулі зімовым сном гарадскія ўлады? Цікава: ці каб хто ўпаў ды паламаўся на тратуары побач царквы, дык на каго тады падаваць у суд, каб атрымаць кампенсацыю? Мо настаяцеля прыхода, мо ўвесь прыход, што не расчысцілі вуліцы?..

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

**СПАЧУВАННІ**

Нашаму Сябру
**Міхасю АНДРАСЮКУ**
**і ягонай Сям'і**
словы спачування ў сувязі
са смерцю
**маці Яўгеніі**

**выказваюць сябры і журналісты рэдакцый „Нівы" і Беларускага Радыё „Рацыя"**

# Прыйшлі лютыя маразы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

**Пасля вялікіх снегападаў і мяцеліц прыйшоў час на калядныя маразы. Асабліва на Беласточчыне і ва ўсёй усходняй паласе Польшчы тэмпература рэзка панізілася якраз на Вадохрышча і моцныя маразы трымаліся цэлы тыдзень, ажно да дня аддання свята Хрышчэння. 25 студзеня ноччу ў Белавежы зафіксавана ажно 30 градусаў марозу. Пры гэтым, некалькі дзён запар градуснікі паказвалі ноччу на Гайнаўшчыне 25-28 градусаў са знакам мінус, а днём тэмпература на двары павышалася да 14-18 градусаў марозу і толькі на гадзін 5-6, калі сонца мацней абагравала вельмі астуджанае ноччу паветра. Сіноптыкі прадвяшчалі, што пасля вялікіх маразоў прыйдзе невялікае ацяпленне, аднак надалей з тэмпературай са знакам мінус, з ападкамі снегу, моцным ветрам і завеямі. Прадбачвалася, што мароз будзе трымаць ажно да канца лютага, а ў прамежках, калі будзе ён слабець, будзе падаць снег і надалей дакучаць вадзіцелям.**

У розных месцах нашай краіны з-за інею, што моцна абляпіў электраправады, абясточыліся вёскі і невялікія гарадкі. На поўдні Польшчы былі месцы, дзе электрычны ток не пастаўляўся нават больш тыдня. Электрычныя правады нішчыла таксама галлё, якое падала на іх пад цяжарам снегу. Якраз на Беласточчыне гэтыя цяжкасці здараліся радчэй, а і цягнікі прыязджалі з меншымі спазненнямі, чым у іншых месцах нашай краіны. Затое ў нас складаней было зранку запусціць аўтамабільныя рухавікі, маючы на ўвазе мацнейшыя, чым у іншых месцах Польшчы, маразы. У марозныя дні больш, чым у звычайныя, псаваліся аўтобусы, здараліся таксама выпадкі, што застрагалі яны ў навеным на дарогі снезе. Асабліва цяжка заводзіць рухавікі ў аўтамабілях, якія начуюць на стаянках побач шматэтажных блокаў. У час самых вялікіх маразоў вадзіцелі клікалі суседзяў, механікаў або тэлефанавалі па таксі, каб дапамаглі ім запусціць машыну. Людзі сталі купляць спецыяльна сканструяваныя бліскучыя пакрывалы, якімі шчыльна прыкрывалі пярэднюю шыбу, каб зранку не трэба было яе скрэбці. Ведаюць аб гэтых цяжкасцях таксама вяскоўцы, якія выязджаючы ў дарогу забіраюць з сабой саматканыя пакрывалы. Знаходзяць таксама спосабы, як прымацаваць лёгкае пакрывала на аўтамабілі, каб не здуў яго вецер. У гарадах здараліся выпадкі, што з-за марозу не працавалі банкаматы і паркаматы, устаноўленыя на свежым паветры. Такіх праблемаў няма ў сёлах, але там з-за вялікіх маразоў былі свае цяжкасці.

— Вельмі цяжка займацца жывёлай у марозны час. Калі мы накормім і напоім жывёлу, падоім кароў і выканаем усе штодзённыя работы на панадворку, то вельмі стомленымі вяртаемся дахаты, — заявіла гаспадыня з Гайнаўшчыны. — Здараецца, што трэба вядром прабіваць лёд у калодзежы, але пасля да сцюдзёнай вады, каб напаіць кароў, даліваем гарачую ваду. Абавязкова цёплай вадой поім цялят. Добра, што ў нас двое ўваходных дзвярэй у хлеў і таму жывёле адносна цёпла. Аднак, калі б мы цяпер будавалі, можна было б хлеў зрабіць яшчэ ніжэйшым і тады было б у ім яшчэ цяплей.

Вяскоўцы асабліва стараліся падкормліваць птушак у адмыслова сканструяваных імі кармушках. Хаця падкормліваннем звярыны ў Белавежскай пушчы ў асноўным займаюцца працаўнікі надлясніцтваў або нацыянальнага парку, то здаралася, што лясная жывёла падыходзіла пад стагі з сенам і саломай, калі тыя не былі абгароджаны, і самі частаваліся.

— У час вялікага марозу перад нашым панадворкам затрымаўся вясковец на трактары і ўжо не мог запусціць рухавік. Так і зацягнулі мы яго на панадворак, — сказаў жыхар Гайнаўшчыны. — У мяне калісьці таксама здаралася, што трактар спыняўся ў дарозе і трэба было разагараваць радыятар. Сёлета ў марозныя дні я ўжо і не карыстаюся трактарам, а запускаю аўтамабіль і важу ўсё на аўтамабільнай прычэпцы.

Бензінны рухавік лягчэй запусціць у час маразоў, чым матор на аўтол (асабліва гэта тычыцца старэйшых машын).

— Я не змог пусціць у ход рухавіка на аўтол. Так і стаіць аўтамабіль у клуні і чакае ацяплення, — сказаў жыхар Бельшчыны. У марозную зіму рэдка рашаліся выязджаць далей старэйшыя вадзіцелі, апасаючыся, што іх машыны маглі б затрымацца ў лесе або на полі. Яны ж ездзяць у асноўным без мабільнікаў і самі не надта ведаюць як справіцца з аварыяй.

Старэйшым, асабліва адзінокім людзям, таксама складана змагацца са снегам і маразамі.

— Надаядае ўжо паліць у печках. Два разы я разагараваю печку ў пакоі, а адзін раз у кухні. Аднак у хаце не надта цёпла і раніцай бывае, што тэмпература толькі крыху перавышае дзесяць градусаў цяпла. Тады я як найхутчэй прыношу дровы і прапальваю ў печцы, — гаварыла жанчына з Гайнаўшчыны, якой ужо больш за 85 гадоў. Сямейнікі і суседзі дапамагаюць ёй расчышчаць дарожку з-пад хаты на вуліцу.

Масмедыі перасцерагалі старэйшых асоб, каб у марозныя дні выходзілі з кватэры толькі ў выпадку неабходнасці. Усё ж такі ў нашым рэгіёне, так як ва ўсёй нашай краіне, здараліся трагедыі. Замярзалі людзі, асабліва бяздомныя і п'яныя.

Аднак не ўсе з нецярплівасцю чакалі адлігі. Былі і такія, што радаваліся прыходу снежнай і марознай зімы. Былі гэта тыя дзеткі, якія не апасаліся гульняў на снезе, і дарослыя аматары зімовага спорту. Хаця апошнія гаварылі, што мароз мог бы быць меншым. Гаспадары, што пасеялі больш азіміны, таксама рады, бо прыкрыла яе тоўстая снежная коўдра, а гэта самыя лепшыя ўмовы для ўдалага перазімавання збожжа. Нават намнога меншы мароз мог бы пашкодзіць азіміне, якая не была б адпаведна забяспечана снежным покрывам. Хаця лекары перасцерагалі перад вялікімі маразамі асабліва дзетак і старэйшых людзей, то былі рады, што ў час марознага надвор'я рэзка паменшала колькасць мікробаў, ад якіх раней масава хварэлі людзі. Нават у час сёлетняй зімы спыніліся разважанні наконт неабходнасці куплі прышчэпкі супраць свінога грыпу. Канешне, адмоўных паслядоўнасцей сёлетняй суровай зімы намнога больш, чым карысцей, але ў нашым клімаце марозная і снежная зіма была нармальнай з'явай і толькі ў апошніх дзесяцігоддзях стала рэдкасцю. Кліматолагі тлумачылі, што вышэйшыя тэмпературы ў час мінулагодніх зім былі паслядоўнасцю ацяплення клімату і калі будуць паўтарацца вялікія маразы і будзе падаць многа снегу, гэта можа абазначаць кліматычную нармалізацыю. Можа і нам трэба было б як найменш наракаць на зімовыя цяжкасці, а больш радасна праходзіць праз жыццёвы шлях.

# Арлянская моладзь гарнулася да спорту

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Многія з нас любяць спорт, нават пасіўна — аглядаючы па тэлебачанні спартыўныя перадачы. Спорт — гэта і культура, і агульнае дабро, а галоўным чынам здароўе і радасць, задавальненне добрымі вынікамі і перамогамі. І яшчэ адно: спорт у школах — ці то на ўроках фізкультуры, ці на пазаўрочных занятках — гэта бяспечней на вуліцах, калі маладыя людзі на тых занятках вышумяцца. Сёння спорт павязаны таксама з рэкламамі і бізнесам ды з афёрамі і судамі...

Даўней, пры камуне, усё адбывалася быццам інакш, спакайней, натуральна і з запалам. Вялікую ўвагу трэба адвесці аматарскаму спорту. У 1960-1970-х гадах амаль кожная вёска мела сваю футбольную каманду. Сёння ў Арлянскай гміне асталася толькі адна (і гэтым трэба задаволіцца, бо не ў кожнай гміне такая асталася), ды і ў ёй большасць гульцоў звонку гміны.

У эпоху, калі камп'ютары былі яшчэ ў сферы мараў, а тэлевізары былі рарытэтамі — не па магчымасцях кожнай хаты, людзі збіраліся на вулічных лавачках, спявалі песні, весяліліся. Часта ўзорам для пераймання быў здаровы лад жыцця і заняткі спортам. Вось, што мне ўдалося даведацца ад Уладзіміра Войны, які нарадзіўся ў 1943 годзе ў Орлі, шмат часу жыў у Беластоку, займаўся мастацкім сталярствам, а на пенсійныя гады вярнуўся ў родную мясцовасць. Спытаў я ў яго, якой у 1960-1970-х гадах была арлянская моладзь.

— Да спорту гарнуліся хлопцы каля дваццацігадовага ўзросту. Тады абсалютна не курылі папяросаў і нават піва не пілі. Бо не было такой моды, тады іншая моладзь была! Калі пабачылі, што я стройна выглядаю, не п'ю, але займаюся спортам, то кожны хацеў так сам выглядаць.

Я тут, у Орлі, недзе ў палове 1960-х гадоў, арганізаваў секцыю цяжкаатлетаў. Займаліся ў ёй маладыя хлопцы Караль Фурса, Пётр Сушч, Мікалай Тхужэўскі, Міхал Карнееў, Аляксей Рыбачук (з Міклашоў) і іншыя. Сустракаліся ў тадышнім клубе (драўляным будынку Гміннага асяродка культуры). Мой брат Аляксандр (настаўнік фізкультуры і заслужаны на Падляшшы трэнер — М. М.) прывёз нам штангу „алімпійку", самі мы выканалі драўляны памост. Святліцовай была тады Вера Валкавыцкая, якой сынка адганяў я ад штангі плескачом, бо і ён ужо браўся за цяжкія яшчэ яму нашы гіры.

У трохбор'і набіраў я 350 кілаграмаў, у тым выжымаў я 120 кілаграмаў. Цяпер цяжкая атлетыка памянялася — няма ўжо выжымання па прычыне шматлікіх траўмаў пазваночніка. Да таго ж спартсмены, асабліва японцы, часта спрытна ашуквалі; яны, невялікія, падсоўваліся пад ужо прыпадняты снарад, а не выжымалі. Асталіся рывок і штуршок.

— І вясковая моладзь прымала ўдзел у спаборніцтвах?

— У той час найлепшым з паляка лічыўся Вальдэмар Башаноўскі. Арлянскія спартсмены выступалі за каманду з Бельска-Падляшскага. Старшынёй быў Сільвеструк. Стартавалі мы тады ў Лапах, разам з секцыяй майго брата. Да сёння захаваліся ў мяне дыпломы.

Аляксандр Война атрымлівае ўзнагароду за дасягненні на педагагічнай і спартыўнай ніве

— Я помню, як Вы калісь рабілі сальта на школьнай пясочніцы...

— Гэта я і зараз зраблю! Адно баюся, каб на галаву не ўпасці, бо тады я важыў 86, а цяпер 112 кілаграмаў. І можа ўжо не маю такой борздасці, бо ж і гадоў у мяне назбіралася. Бо сальта заснована на скорасці — адбіўся, і ўсё! Ці ўперад, ці ўзад; узад нават лягчэй. Калісь я таксама добра нырэў, пад вадой мог вытрымаць тры мінуты і больш. Сваю нарачоную паднімаў на адной далоні, а пасля і свайго 14-гадовага сына. Таксама ў войску не было мацнейшага. У чэмпіянаце Варшаўскай вайсковай акругі 17,5-кілаграмовую гіру падняў я наперамен — раз адной рукою, раз другою — 1250 разоў. Мог так падымаць і бадай два дні. Ужо пачалі мне хустачкай махаць, што ўжо ўсе здаліся, а я падымаў і падымаў, пакуль не абрыдла.

— Як і чаму спыніла дзейнасць цяжкаатлетычная секцыя ў Орлі?

— Калі я з сям'ёю выехаў у Беласток, то і ўсё рассыпалася. Штангу ўзяў Алёша Рыбачук з Міклашоў і пасля хіба здаў на лом.

У маім архіве захаваліся, запісаныя ў студзені 1998 года ўспаміны пакойнага ўжо Алёшы Рыбачука; вось што ён быў сказаў:

„У Орлі, калі трэніраваўся Воўка Война, мы вучыліся, а пасля ўжо ў Бельск; мне тады было 23-24 гады, стартаваў я ў лёгкай вазе. У мяне дома была штанга і я трэніраваўся далей разам з Каралем Фурсам. Пасля некалькі разоў прыязджаў да нас Сашка Война з Ружанастока. У Бельску ў той час выступаў старэйшы за нас Мікалай Цар, які працаваў у ПОМе, ездзілі мы на спаборніцтвы. Штурхаў я 120 кілаграмаў, выжымаў 85 і вырываў 70 — разам у трохбор'і атрымлівалася 275 кілаграмаў. У спаборніцтвах займаў я 2-3 месцы. Стартавалі і спартсмены з Ружанастока. Удачы спадарожнічалі нам, калі вёў нас Сашка Война, быў ён добрым трэнерам. Прыязджаў ён і ў Бельск, і ў Беласток. Мы — з Каралем — ездзілі многа разоў, а пасля... зракліся. Пачалі „гуляць", а гэта ўжо іншая справа".

Асабліва таленавітыя арляне вылучыліся ў папулярызацыі многіх галін жыцця ў маштабе не толькі свайго ваяводства. Шкада, што некаторым з іх не пашанцавала даўжэй цешыцца зямным жыццём, але плён іхняй працы і памяць пра іх астаюцца. Вось ужо амаль ад дваццаці гадоў у кожны кастрычнік на беластоцкім стадыёне ў Звярынцы ладзіцца мемарыял Аляксандра Войны, народжанага ў Орлі настаўніка фізкультуры і знакамітага трэнера. Пра ягоны жыццёвы і працоўны шлях спытаў я ягонага брата Уладзіміра, таксама спартсмена, а па прафесіі мастацкага сталяра.

— Ці Вы спаборнічалі з братам?

— Мы ўвесь час былі разам. У прадшколле старэйшы на тры гады брат не хадзіў, бо такога яшчэ ў Орлі не было. У пачатковай школе брат ужо захапіўся спортам, любіў лёгкую атлетыку — бегі, кіданне кап'я і дыска, вельмі добра гуляў у валейбол. Настаўніка фізкультуры тады не было — вёў заняткі выхавацель.

Пасля падставоўкі брат працягваў навуку ў Бельскім педліцэі, жыў у інтэрнаце. І далей працягваў займацца спортам — лёгкай атлетыкай і валейболам. Быў дужы і скочны. Пасля брат вучыўся ў Настаўніцкай студыі ў Элку, паралельна працуючы настаўнікам фізкультуры ў Сельскагаспадарчым тэхнікуме ў Ружанастоку. І ў тым тэхнікуме заснаваў цяжкаатлетычную секцыю, якая спаборнічала пад шыльдай Дубровы-Беластоцкай. Былі ў ёй таксама настаўнікі фізкультуры: Гапанюк з Варшавы, Дваракоўскі, Ражкоўскі... І гэта была вельмі моцная секцыя ва ўсіх вагах. А трэніраваў яе ўвесь час мой брат Аляксандр Война, які таксама выступаў на памосце. Ён набіраў у трохбор'і каля 350 кілаграмаў, а гэта быў ужо сур'ёзны вынік; у 1960-х гадах Аляксандр Война быў найлепшы ў Беластоцкім ваяводстве.

У тэхнікум, дзе ён навучаў, паступалі таленавітыя спартсмены з Орлі, напрыклад, Коля Ярымовіч быў знакамітым дыскаболам. Таксама з Мора тамашні кіраўнік школы Васіль Ляшчынскі падсылаў у Ружанасток здольных хлопцаў.

Брат, працуючы настаўнікам, штудзіраваў і завочна закончыў Акадэмію фізкультуры ў Познані і далей працаваў у Ружанастоку. А пасля перабраўся з сям'ёю ў Супрасль, дзе вучыў фізкультуры ў Тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі. Ды не толькі, бо ўвесь час трэніраваў лёгкаатлетаў беластоцкага спартклуба „Падляшша". Вылаўліваў спартыўныя таленты, ягоныя вучні і выхаванцы ўвайшлі ў польскі і еўрапейскі авангард.

У лютым 1990 года Аляксандр нечакана памёр, пражыўшы адно 50 гадоў. З таго часу на стадыёне ў Звярынцы адбываецца яго мемарыял. Прыязджаюць тады ягоныя калегі, былыя чэмпіёны і прымаюць удзел у спаборніцтве разам з моладдзю.

Сыны Аляксандра таксама сталі спартсменамі: Цэзары быў чэмпіёнам Польшчы па кіданні кап'я; зараз ён навучае фізкультуры ў Беластоку, а жыве ў Супраслі. Тамаш таксама быў выдатным кідальнікам кап'я, зараз працуе ў варшаўскім банку. Мае сыны: старэйшы Пётр і малодшы Канрад таксама займаліся спортам, культурызмам; старэйшы і зараз наведвае трэнажорную залу.

## Вядомая і невядомая Латвія

Апошняя мінулагодняя сустрэча ў Цэнтры навуковых даследаванняў у Ольштыне была прысвечана Латвіі — з дакладам выступіў Ірэнэўш Календа.

Латвія распаложана на ўсходнім узбярэжжы Балтыкі. Яе тэрыторыю раздзяляе на дзве адметныя часткі рака Даўгава (Дзвіна), якой у Латвіі 357 кіламетраў. На сушы краіна мяжуе з Эстоніяй (даўжыня граніцы з гэтай краінай 339 км), Расіяй (217 км), Беларуссю (141 км) і Літвою (453 км). Марскога берага ў Латвіі 531 кіламетр. На тэрыторыі Латвіі пражывае 702,5 тыс. расейцаў, 97 тыс. беларусаў, 63,5 тыс. украінцаў, 60 тыс. палякаў, 10 тыс. яўрэяў, 8 тыс. ромаў, 3,5 тыс. літоўцаў, 2,7 тыс. эстонцаў...

Дакладчык расказаў шмат пра гісторыю краіны, ад пляменнага перыяду, цераз панаванні розных суседзяў аж да навейшых дзён. Цікавасць публікі выклікала адна малавядомая падзея з паходу Напалеона на Расію. Расійскае войска заняло ў чэрвені 1812 года абаронныя пазіцыі на подступах да Рыгі перад горадам Мітава (цяпер Елгава). Камандзір казацкага атрада маёр Апушкін, пабачыўшы на дарозе ў Мітаву хмару пылу, падумаў, што яе ўзняла наступаючая французская армія і загадаў спаліць мост на рэчцы Доблен. Пасля, аднак, высветлілася, што пыл узняў статак быкоў, якіх гналі казакі. За праяўленую паніку маёра арыштавалі і аддалі пад суд. Крыху пазней рускія падпалілі рыжскія прадмесці і ў выніку разнесенага ветрам пажару згарэла 800 будынкаў і без даху над галавой асталося каля сямі тысяч рыжан...

**Андрэй ГАЎРЫЛЮК**

## Нетыповыя „ляуркі"

21 студзеня адзначаўся День бабулі, а наступнага дня — Дзень дзядулі. З гэтай нагоды малечы ўручалі бабулям і дзядулям віншавальныя лісты з малюнкамі, жадаючы ім моцнага здароўя і традыцыйных „сто лят".

Да гэтых віншаванняў далучылася Ваяводская камендатура паліцыі ў Беластоку. Функцыянеры Папераджальнага аддзялення Рэгіянальнага асяродка грамадскай палітыкі стварылі малечам нетыповую „ляурку" для размалёўвання. Адна прызначалася для бабулі, другая для дзядулі. На адваротнай старонцы віншавальнага ліста запісана была перасцярога перад ашуканцамі і зладзеямі. Гайнаўскія паліцэйскія сустрэліся з малечамі ў садках 20 студзеня і ўручылі маляванкі.

**(ус)**

**СПАЧУВАННІ**

Нашаму Сябру
**Яраславу ІВАНЮКУ**
**і ягонай Сям'і**
словы спачування ў сувязі
са смерцю
**бацькі Мікалая**

**выказваюць сябры і журналісты рэдакцый „Нівы" і Беларускага Радыё „Рацыя"**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# У Нарве рабілі павукі

У Пачатковай школе і гімназіі ў Нарве 15 і 16 снежня незвычайныя дні. Школьнікі VI класа і гімназісты-першакласнікі вучыліся рабіць павукі з саломы. Гэтаму майстэрству вучыў спадар Міхал Філяновіч са Скарышэва, уласнік агратурыстычнай кватэры і музея „Рута". Мары вучняў і настаўніц дапамог здзейсніць Кааператыўны банк у Нарве, які выступіў спонсарам гэтага мерапрыемства. Словы вялікай падзякі добрым людзям за гэта выказваюць дзеткі, моладзь і настаўніцы Ніна Абрамюк і Дарота Шамборская.

Заняткі працягваліся да шостай гадзіны вечара (13.00-18.00). Вельмі важная ў гэтай працы — салома. Спачатку трэба яе старанна пачысціць, парэзаць на роўненькія палачкі даўжынёю ад каленца да каленца саломінкі. Пасля падабраць адпаведную іголку з саломы, працягнуць нітку праз саломінкі. Калі атрымаюцца трохкутнікі, трэба так іх павязаць, каб выйшаў павук. Спачатку вучням не атрымлівалася, памыляліся пры вязанні трохкутнікаў. Пры гэтым было многа жартаў, смеху. Дзякуючы цярплівасці, вучні зрабілі некалькі павукоў — вялікіх і маленькіх.

Колькі было радасці і задавальнення, калі атрымлівалі пахвалу ад сяброў і настаўнікаў за свае саламяныя вырабы! Выстаўку прац зрабілі ў класах. Павукі да сёння ўпрыгожваюць залы ў пачатковай школе і гімназіі.

**Ніна АБРАМЮК**

# Увага!!! Конкурс на „Валянцінкі"!

Даражэнькія, неўзбаве, бо ўжо 14 лютага, Свята кахання. Многія з Вас выглядаюць гэтага дня, бо тады можна, а нават трэба, прызнацца ў сімпатыі. Мы таксама не забываем пра свята і з гэтай нагоды рэдакцыя „Зоркі" падрыхтавала конкурс. Прапануем пазнаёміцца вам з найбольш вядомымі карцінамі ў беларускай культуры, якіх натхніла каханне. Паколькі конкурс мае адукацыйны характар, мы прапануем яго ў форме апытальніка. Адказы можаце знайсці ў беларускім інтэрнэце. Мы спадзяемся, што дзякуючы конкурсу вы пацікавіцеся беларускімі сайтамі, літаратурай і мастацтвам, геаграфіяй і тым самым пашырыце круг сваіх зацікаўленняў. У першую чаргу, вядома, мы спадзяемся на добрую гульню. Многія пытанні маюць гумарыстычны характар.

Рэдакцыя „Зоркі" падрыхтавала Вам файныя і арыгінальныя ўзнагароды, м.інш. кашулькі ад Радыё Рацыя, кампакт-дыскі з сучаснай беларускай музыкай, беларускія кніжкі. Адказы ў тэрміне да 14 лютага (уключна) вы можаце дасылаць на наш э-мейл: zorka@niva.iig.pl; або, традыцыйна, па пошце. Каб прыняць удзел у жараб'ёўцы, трэба правільна адказаць хоць на тры пытанні.

***1. Хто, паводле календара „Нівы", святкуе імяніны 14.02. (на „Валянцінкі"):***

а. Трыфан і Пятро,
б. Маргарыта і Ала,
в. Віктар.

***2. Які персанаж-жывёла дапамагае хлопцу ў народных песнях пра каханне:***

а. цмок,
б. вол,
в. конь.

***3. Самая шчаслівая пара каханкаў у беларускай літаратуры гэта:***

а. Ганна і Васіль („Людзі на балоце" Івана Мележа),
б. Ён і Яна („Ён і Яна" Янкі Купалы),
в. Яська і Марыська („Марыська чарнабрэва, галубка мая" Кастуся Каліноўскага).

***4. Самы славуты раманс у беларускай літаратуры „Зорка Венера" напісаў:***

а. Змітрок Бядуля,
б. Максім Багдановіч,
в. Юры Гумянюк.

***5. Музай віцебска-парыжскага мастака Марка Шагала была:***

а. жонка Бэла,
б. паэтка Цётка,

Танечка Малеша з Крынак

в. сяброўка Хана.

***6. Якое беларускае мястэчка аздабляе легенда пра каханне Барбары Радзівіл і караля Зыгмунта Аўгуста:***

а. Бялынічы,
б. Нясвіж,
в. Орлю на Падляшшы.

***7. Пад якім сімвалам-дрэвам выступае дзяўчына ў беларускай народнай песні:***

а. калінай,
б. елкай,
в. дубам.

***8. У якім падляшскім горадзе або мясціне знаходзіцца вуліца Aleja Zakochanych:***

а. у Боцьках,
б. у Беластоку,
в. у Саколцы.

***9. Якое возера з'яўляецца сімвалам рамантычнага кахання:***

а. Дрысвяты,
б. Семяноўскае вадасховішча,
в. Свіцязь.

***10. Каб наклікаць у дом каханне, беларускія дзяўчаты аздаблялі хату пад Новы год:***

а. саламяным павуком,
б. амялой,
в. елкай.

***11. Які старажытны бажок дапамагае ў справе кахання:***

а. Гермес,
б. Зюзя,
в. Амур.

***12. Які орган цела ў еўрапейскай культуры лічыцца сімвалам кахання:***

а. ныркі,
б. мышцы,
в. сэрца.

# Музеі-скансэны Падляшша

У гэтай частцы нашага цыкла раскажам не пра адну мясцовасць, але пра некалькі. Гэтым разам прапаную пагаварыць пра музеі-скансэны, якіх на Падляшшы шмат.

І не ідзе тут пра вялікія ўстановы, але пра музеі створаныя людзьмі, якія стараюцца захаваць сваю культуру і традыцыю. У вёсках, якія адведалі мы дагэтуль, таксама знаходзяцца такія невялікія музеі.

Дастаткова ўспомніць Музей матэрыяльнай культуры „Бацькаўшчына" ў Рыбалах. Заснавалі яго ў будынку былой школы айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна. Сабраць вялікую колькасць экспанатаў, якія зараз знаходзяцца ў музеі, удалося дзякуючы дапамозе прыхаджан, якія заглянулі ў свае клуні, на гарышчы і знайшлі старыя прылады, якія ім ужо непатрэбныя. Дзякуючы гэтаму ў Музеі матэрыяльнай культуры „Бацькаўшчына" знаходзіцца зараз некалькі соцень экспанатаў.

Захаваць памяць, гісторыю і спадчыну стараецца таксама Міхал Філяновіч з вёскі Скарышэва, што ў Нарваўскай гміне. На сваім панадворку, у гаражным будынку спадар Філяновіч заснаваў музей „Рута", дзе знайсці можна шмат цікавых экспанатаў, сярод якіх прыгожыя строі ды дакументы пра вёску Скарышэва. Колькасць экспанатаў у спадара Міхала настолькі вялікая, што зараз знаходзяцца яны таксама ў спецыяльна падрыхтаваным клуні.

З мясцовасцей, якія наведалі мы дагэтуль, свой музейчык маюць таксама Дубічы-Царкоўныя. У прыгожа адноўленым будынку старой школы (на здымку) сарганізаваны музей з мемарыяльным пакоем добраахвотнай пажарнай каманды. У гэтым музеі можна не толькі паглядзець экспанаты, але і прысутнічаць у арганізаваных тут майстар-класах па розных тэмах, звязаных з нашай спадчынай.

Такіх музеяў як у Скарышэве, Рыбалах ды Дубічах знайсці можна на Падляшшы яшчэ некалькі. Дастаткова ўспомніць Музей малой бацькаўшчыны ў Студзіводах, які ўвесь час развіваецца. Зараз апрача сельскай хаты стаіць там ужо і мяшчанская.

Усе гэтыя музеі заснаваны людзьмі, якім неабыякавая іх спадчына. Але таксама і мы можам ім трохі дапамагчы. Калі ў нашай хаце знаходзіцца старая непатрэбная прылада, можа варта пашукаць ці ў нашай ваколіцы нямя ніводнага аматара даўніны, які захоўвае такія прылады і запытаць ці не спатрэбілася б яму тое, што маем.

Такім невялічкім жэстам можам спрычыніцца да таго, што памяць пра нашае мінулае, пра вырабы нашых бабуль і дзядуляў не загіне.

**Міхась СЦЕПАНЮК**

**Міра ЛУКША**

# Валянцінкі

**Ой, які марозны люты!**
**Снегам увесь свет задзьмуты!**
**Ды чырвона і гарача**
**кветка ружы скажа йначай.**

**Усё у сэрцах, нават пернік...**
**Хто ў галоўцы мне заверне?**
**Хто мне сэрцайка закружыць?**
**Хто мне ўручыць тую ружу?**

**Напішу я табе вершык.**
**Будзе вершык самы першы,**
**верш пра шчырае каханне.**
**Верш не ружа, – не завяне.**

**Ты мне сэрца намалюеш**
**і напішаш, што адчуеш,**
**заварожыш холад словам.**
**Сэрца будзе нашым сховам.**

# Музыка з кайфам

**Піт Паўлаў**

Набліжаецца да дваццаткі. Не, гэта не гісторыя беларускага падлетка, які намерваецца рабіць сусветную музычную кар'еру. Гэта і не гісторыя чалавека, якому неўзабаве споўніцца дваццаць гадоў. Гэта хутчэй за ўсё пару слоў пра музыка, які неўзабаве адзначыць дваццаты альбом у сваім творчым жыцці.

Піт Паўлаў запісвае свае альбомы з палавіны 1990-х гадоў. Зразумела, яго магчымасці развіваліся паралельна з развіццём гурту „N.R.M.". Гэта пачатак яго вялікай музычнай папулярнасці, якой скарыстаўся ў сольнай працы. Спачатку быў асацыяваны як гітарыст. Звар'яцелы гітарыст, які мімікай твару і жэстамі на сцэне кантраставаў з даволі стрыманым Лявонам Вольскім. Паціхеньку аднак развіваў свае пазарокавыя зацікаўленні ў музыцы, якіх вялікую частку можна назваць фолькам. Калі ведаеце, хаця б з назвы, гурт „KRIVI", дык павінны ведаць, што граў там таксама Піт Паўлаў. Але зараз ужо нават не трэба вяртацца да мінуўшчыны, бо Пеця не пакінуў фолькавых інспірацый разам з адыходам ад „KRIVI", бо сарганізаваў сваю прастору для стварання такой якраз музыкі ды назваў яе „PetePaff". І гэтага яму недастаткова, таму свой час дзеліць між „N.R.M.", „PetePaff" і „Garadzkija", а два апошнія праекты гэта ўжо абсалютна яго ідэя. Дзеля яе піша музыку, тэксты, часам нанава аранжыруе песні, як было ў выпадку каверу на песню гурту „Metallica", пра што я пісала апошнім часам. Піт не адмаўляецца таксама ад дапамогі іншым, таму паяўляецца на альбомах іншых выканаўцаў, спрычыняецца таксама да канчатковага выгляду гэтак званых супольных праектаў, у тым ліку такіх як „Народны альбом" ці „Я нарадзіўся тут".

Калі трэба было б мне ацаніць што Піт Паўлаў кахае ў музыцы найбольш, сказала б: „Усё, што мае струны!" Кожны раз, калі гляджу на яго працу з інструментам, асабліва такім як домра ці балалайка, відаць апеку і чуллівасць. Зусім як да дзіцяці. Кахае ён, безумоўна, музыку. Таму і не перашкаджае яму быць не толькі майстрам, настаўнікам для малодшых, але бывае, што становіцца вучнем. Бо трэба ісці наперад.

**i_basovka@o2.pl**

## *Польска-беларуская крыжаванка № 6*

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 2:

Кніга, сяло, стол, Ян, яслі, лесвіца, ара, неба, жыта, ты. План, кус, Тула, лясны, свет, сяліба, п'яніца, торт, ты.

Узнагароды, кампакт-дыскі з беларускай сучаснай музыкай, выйгралі **Агнешка Анішчук, Яраслаў Нічыпарук, Радаслаў Сідарук, Войцех Лаўрыновіч** з Новага Корніна, **Адрыян Жукоўскі** з Дубін, **Мартына Швед, Эва Аярчук, Віялета Дработка** з Бельска-Падляшскага, **Якуб Назарук** з Гайнаўкі. Віншуем!



# Украіна — Букавіна? І рублі

Юрка Ляшчынскі

Першае, што раблю, прыязджаючы ў нейкі горад — купляю мясцовую прэсу. Якім было маё здзіўленне, калі ў Чарнаўцах, што на ўкраінскай Букавіне, прыйшлося мне плаціць за некалькі газет.

— Два рубля, 35 капеек, — пачуў я ад прадаўшчыцы.

І не цана мяне здзівіла, а назва мясцовай валюты.

— Значыць, дзве грыўны... — крыху збянтэжана шукаў я пацвярджэння, што хіба грыўны, а не рублі тут валюта...

— Так, так, два рубля, ну, там — кажуць грыўны, — упэўнена паясніла жанчына.

І сапраўды, у Чарнаўцах ды цэлай вобласці грыўны называюць рублямі. Па-старому. І не толькі называюць. Тут, нягледзячы на напорыстую ўкраінізацыю ў апошнія дваццаць гадоў — мала хто размаўляе па-ўкраінску. Калі загаворыш дык і адкажуць, а так — то на „общепонятном", хаця ўсе надпісы ў горадзе, на вуліцах, рэклама і ўсе бланкі — па-ўкраінску. Нават калі ў адміністрацыі гасцініцы „Чарамош" спытаўся я: „На якой мове ў вас лепш звяртацца: па-руску ці па-ўкраінску?", жанчына адказала: „Навошта вам на гэтай украінскай, калі цалкам выдатна гаворыце па-руску!"

„Ну так!" — падумаў я, разглядаючыся навокал па гатэлі: ён жа быццам рэлікт Савецкага Саюза! Не толькі сваім унутраным і вонкавым выглядам, але і ўсімі працэдурамі пры раскватараванні, абмене валюты і працай кафэ-рэстаранаў ды яшчэ тэлевізарам „Гарызонт", без пульта. Тым не менш гэта не абазначае, што Букавіна нецікавая. Зусім наадварот.

Горад Чарнаўцы велічынёю нашага Беластока (першая аналогія), размешчаны на абодвух берагах ракі Прут (хаця гасцініцы акурат з такой назвай няма). На правым беразе ракі гістарычныя Чарнаўцы, па-румынску *Cernauti*, бо да 1940 года знаходзіліся яны ў межах Румыніі. На левым баку Прута — цяпер квартал горада, раней асобны гарадок — Садагора. Дарэчы, і гэта станоўчы бок пражывання ў „Чарамошы"; з акон вышэйшых паверхаў адкрываўся маляўнічы краявід на круты Прут і згаданы квартал Садагора.

Да саракавых гадоў мінулага стагоддзя Садагора была тыповым яўрэйскім мястэчкам на Букавіне. Нават і называлі яе „Іерусалімам над Прутом". Невыпадкова. Тутака была створана славутая ва ўсім свеце песня „Hawa Nagila", спяваная таксама і ў Польшчы пры ўсіх яўрэйскага характару мерапрыемствах. Кожны яўрэйскі калектыў мае яе ў сваім рэпертуары. Тут чарговыя аналогія да Беластока — шматкультурнасць. Так у сучасным, як і ў гістарычным вымярэнні. У свой час, асабліва да першай сусветнай вайны, пражывала тут некалькі нацый: немцы, палякі, русіны, яўрэі і румыны, ды яшчэ ў меншай ступені прадстаўнікі венграў, туркаў і армян. А пасля 1944 года, значыць, пасля далучэння Букавіны да СССР, прыязджалі расіяне і іншыя нацыі Савецкага Саюза, але іншыя народы затое загінулі або з'ехалі. Такое перамяшанне несельніцтва — быццам у пасляваенным Беластоку. І так — зараз, пасля войнаў, рэпатрыяцый і змены межаў у Чарнаўцах дамінуюць украінцы, хаця значны адсотак складаюць расіяне і румыны. Дарэчы, не ведаю, ці не раблю памылкі, называючы адну з этнічных груп Букавіны — румынамі. Калі нават на базары, калі купляў свойскае віно (на жаль, мізэрнай якасці), спытаўся я ў жанчын, якой яны нацыянальнасці, яны адказалі: „Мы — малдаванкі"!

Палац мітрапалітаў у Чарнаўцах

Пра шматкультурнасць найлепш сведчаць захаваныя помнікі архітэктуры і культуры (тут іх намнога больш, чым у Беластоку).

Пачнем з сакральных аб'ектаў. Выгадна іх наведваць, бо амаль усе яны знаходзяцца на адной вуліцы або паблізу яе. На вуліцы Кабылянскай. Праваслаўны Святадухаўскі сабор з паловы XIX ст. пабудаваны на ўзор Ісакіеўскага сабора ў Санкт-Пецярбургу, а на другім баку вуліцы армянская царква святых Пятра і Паўла (на жаль, заменена ў залу арганнай музыкі). Зусім побач румынская царква, якая сваім выглядам нагадвае цэрквы Трансільваніі. Таксама з XIX стагоддзя. А крыху далей — лютэранская кірха. А вось на вуліцы Рускай, як не дзіўна, красуецца грэка-каталіцкая царква Успення Прасвятой Багародзіцы з 1820 года. Варта яшчэ наведаць рыма-каталіцкі храм Уздзвіжання Крыжа Гасподняга з 1793 года, у якім у свой час маліліся немцы і палякі. Зараз святыя імшы служацца тамака па-польску і па-ўкраінску. Прысутнасць яўрэйскай абшчыны ў Чарнаўцах відавочная і зараз. Для вернікаў адкрыта сінагога Беняміна з 1923 года, хаця самая даўняя, маўляў, шэдэўр, бажніца Тэмпель, што па вуліцы Ватуціна, заменена ў кіно „Чэрнівці" (мясцовыя гэтае кіно называюць „Кінагога"). Дарэчы, у Чарнаўцах як дагэтуль няма помніка Сцяпану Бандэру, такога паўсюднага на Заходняй Украіне. А вось вуліца савецкага генерала Ватуціна, які загінуў у змаганні з Украінскай паўстанчай арміяй (УПА) існуе... Варта яшчэ ўспомніць пра сабор святога Мікалая з 1939 года, паводле праекта Іона Манеску, які меў сведчыць пра магутнасць і веліч румынскай дзяржавы. Тады Румынія была большая як цяпер: у яе складзе была не толькі Букавіна, але і сённяшняя Малдова, цэлая дэльта Дуная і частка балгарскага ўзбярэжжа Чорнага мора; Вялікая Румынія — Romania Mare — такую карту можна купіць у Румыніі. Але як у такіх выпадках мегаламаніі (пачуцця велічнасці) бывае, год пазней абшар Вялікай Румыніі паменшаў. Бесарабію (Малдову) і Букавіну захапіў Савецкі Саюз. Спачатку толькі на год, а ўжо з 1944 года „на даўжэй" (па сёння). Цяпер Букавіна ў незалежнай Украіне, а Малдова сама з'яўляецца незалежнай рэспублікай. Во!

На той жа вуліцы Кабылянскай

Шматнацыянальны Івана-Франкоўск (да 1962 г. — Станіславаў) „Бажніца патрабуе рамонту", — гаворыць мясцовы рабін

знаходзяцца чатыры Нацыянальныя дамы: польскі, нямецкі, яўрэйскі і ўкраінскі — у свой час культуратваральныя калыскі сваіх нацый. Толькі Румынскі дом у іншым месцы, але непадалёк. Усе нацдамы з канца XIX — пачатку XX стагоддзяў.

Перш-наперш, гледзячы на сённяшні горад, трэба мець на ўвазе той факт, што залаты час для Чарнаўцоў прыпаў на перыяд панавання кесара Франца Іосіфа. Тады Букавіна стала самастойным княствам у рамках Аўстра-Венгерскай манархіі.

У XIX ст. быў заснаваны ўніверсітэт — найдалей на ўсходзе размешчаная нямецкамоўная навучальная ўстанова. За 30 гадоў, з 1880 па 1910 год, лік жыхароў горада павялічыўся з 34 да 85 тысяч.

На канец наведвання помнікаў сталіцы Букавіны пакінуў я сапраўдную жамчужыну — палац букавінскіх мітрапалітаў з 1862-1882 гадоў. Сам ён у неараманскім стылі з відавочным уплывам візантыйскай архітэктуры. Цэласць складаюць чатыры часткі — галоўны палац, будынак семінарыі, семінарыйная царква і дом для гасцей. Аўтарам праекта быў чэшскі архітэктар Іосаф Гляўка. Зараз у памяшканнях палаца знаходзіцца ўніверсітэт. Таксама ў цэнтры горада.

Аднак, не аднымі помнікамі гісторыі, архітэктуры ці храмамі жыве турыст.

Звычайнае жыццё горада — дзённае і начное — думаю, не менш цікавае. І тут, на жаль, я крыху расчараваўся. Крыху? Бар ці піўнушку ў цэнтры знайсці не так і лёгка. Больш шыкоўнае — вядома, дарагое, танных, бадай, няма. Затое людзей, папіваючых піва на вуліцы — процьма. Царствуюць „Львоўскае" і „Абалонь" у пластмасавых бутэльках у паўтара і два літры ёмістасці. Цана прыстойная, якасць нядрэнная. З таго, што ведаю, то так як і ў Беларусі ды Расіі, піва не з'яўляецца спіртным напоем, дык нічога дзіўнага, што ў парках, але і на тратуарах можна ўбачыць дзяўчат ці юнакоў з пляшкай „Львоўскага". Аднак мае гэта і адмоўны бок. Нідзе ў горадзе не знойдзеш публічнага туалета (гэта чарговая аналогія з Беластокам). За патрэбай можна было схадзіць у гэтак званыя „ігравыя салоны", дзе, дарэчы, таксама прадаюць піва. Ну, вядома, у тыя звычайныя, бо ў такія больш эксклюзіўныя не ўпусціць ахоўнік. Аднак і адных, і другіх салонаў вельмі многа. Нават больш, чымсьці было ў Польшчы ў час азартнай афёры.

Усё-ткі калі чалавек чагосьці вельмі шукае, дык у рэшце рэшт знойдзе. Піўныя бары, аж тры, знаходзіліся недалёка ад нашай гасцініцы „Чарамош". Апрача піва, многія заказвалі сабе „свіныя вушы". Можна паспрабаваць, хаця сам не ведаю, адкуль такая мода на такую закусь, бо не толькі на Украіне, але чую, што і ў Літве... А мо сапраўды няма прыстойнай закускі, як папярэджвалі мяне знаёмыя?.. А нядаўна бачыў такі „ласунак" у Беластоку...

На Букавіне пабываў я дзесьці дваццаць тыдні пасля славутай „паводкі стагоддзя". Частка Чарнаўцоў была заліта вадою, у тым ліку і мясцовы базар. Вярнуўшыся ў нумар, уключыў я рэлікт савецкага часу „Гарызонт", а там — і пра паводку, дакладней пра яе паслядоўнасці. Журналіст пытаецца ў эпідэміёлага: „Ці пасля такой паводкі можам гаварыць пра пагрозу эпідэміі? Дызентэрыі, халеры?..". А чыноўнік адказвае: „Не, абсалютна не, ніякай пагрозы няма". І сапраўды, людзі паверылі. Базар працуе, быццам нічога не здарылася. Тыя тавары і прадукты, якія паводка знішчыла ўшчэнт — прыбралі, астатнія перамылі, пачысцілі і прадаюць далей. Лепш, каб не было такой аналогіі з Беластокам!

Назад вярталіся мы па шашы цераз памежныя да вайны Залешчыкі. Пераехалі праз мост на Днястры (да 1939 г. гранічны паміж II Рэччу Паспалітай і Каралеўствам Румыніі). Той самай дарогай, толькі ў другі бок, як у верасні 1939 года ўцякаў „ганарысты" польскі ўрад.

*Рэзюмэ даклада прафесара Антона Міпрановіча, зачытанага 26 лістапада 2009 года на навуковай канферэнцыі „Рэлігійныя перамены на Беларусі"*

# Рэлігійнае жыццё беларускай эміграцыі пасля другой сусветнай вайны

**Пасля заканчэння вайны большасць епіскапаў і духавенства, якія былі заангажаваны ў стварэнне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Мінску ў жніўні-верасні 1942 года, апынулася ў Нямеччыне, а таксама ў Італіі, Аўстрыі, Францыі і Чэхіі. Там працягвала дзейнасць Беларуская цэнтральная рада і былі створаны іншыя арганізацыі. У Рэгенсбургу [на ўсходзе Баварыі — А. В.], дзе спынілася большая частка епіскапаў, была створана першая парафія св. Еўфрасінні Полацкай, а пасля падобныя парафіі былі заснаваны і ў іншых мясцовасцях Нямеччыны.**

Епіскапы БАПЦ хацелі звязацца кананічна з Рускай зарубежнай праваслаўнай царквой і некалькі разоў даходзіла да сустрэч, да размоў. Не заўсёды ўдавалася ім, таму што беларускія актывісты з Беларускай цэнтральнай рады, калі пра гэта даведаліся, вельмі хутка стварылі Беларускі царкоўны камітэт у Рэгенсбургу і выступілі супраць планаў беларускага епіскапату. Дайшло да таго, што 10 лютага 1946 года, калі сабор Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы прыняў просьбу беларускіх епіскапаў і ўключыў іх у свой склад, беларускі свецкі актыў апратэставаў гэта, заявіўшы, што РЗПЦ адмоўна глядзіць на нацыянальныя памкненні беларусаў, таксама ў эміграцыі, і таму яны не будуць супрацоўнічаць з ёю і заклікалі да стварэння незалежнай беларускай аўтакефальнай царквы. Заклікалі таксама, каб беларускія епіскапы вярнуліся да царквы беларускай і адышлі ад царквы расійскай. Гэтая падзея мела вельмі адмоўны ўплыў на паводзіны цэлай беларускай эміграцыі.

Як вядома, у былога гродзенскага архіепіскапа Савы (Юрый Саветаў, на здымку), ці яго аднадумніка Мацея, была прапольская арыентацыя і яны намагаліся стварыць Польскую праваслаўную царкву на эміграцыі. У Нямеччыне быў таксама заснаваны рух „крывічоў", які ўзначалілі каталіцкія святары, Янка Станкевіч, Францішак Кушаль і іншыя. „Крывічы" гаварылі, што сапраўднай рэлігіяй беларусаў з'яўляецца ўнія і Праваслаўная царква з яе адраджэннем нічога супольнага не мае. Яны сталі шмат выдаваць, пры дапамозе Ватыкана, м.інш. беларускі часопіс „Божым шляхам", у Рыме пачаў выходзіць „Зніч", крывічане выдавалі ў Парыжы „Беларускія навіны", у Нямеччыне паўстала „Бацькаўшчына". Дарэчы, некаторыя беларускія аўтары, напр. Станкевіч, у эміграцыі называлі, што гэта паланафілы і здраднікі Беларускай праваслаўнай царквы.

У той самы час у Лювэне ў Бельгіі быў створаны каталіцкі ўніверсітэт, дзе было шмат студэнтаў ад „крывічан" і яны пашыралі ўніяцкую місію пры дапамозе Рыма. Цікава тое, што пад петыцыяй да папы каб стварыць беларускую ўніяцкую місію падпісаліся не толькі беларусы, але праваслаўныя расійцы, якія не хацелі вяртацца ў Савецкі Саюз — іх падпісалася найбольш. Дарэчы, большасць выпускнікоў гэтага ўніверсітэта ніколі па-беларуску не гаварыла, і пасля большасць іх адправілася ў Канаду.

Мікола Абрамчык [прэзідэнт Рады БНР у 1947-1970 гг. — А. В.], які там таксама дзейнічаў, заявіў, што трэба знайсці епіскапа для Беларускай аўтакефальнай царквы. Спачатку хацелі ўзяць былога епіскапа пінскага Аляксандра (Іназемцава), які быў спачатку не толькі епіскапам Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, а пасля і Беларускай аўтакефальнай царквы ў час нямецкай акупацыі. Але калі епіскап Аляксандр меў нейкія праблемы [Звяртаў ён увагу на тое, што недастаткова мець епіскапаў, але ў першую чаргу „трэба мець дзесятак свядомых беларусаў і абсадзіць імі святарскія пасады ў беларускіх перасыльных лагерах". Скептычна падыходзіў да высілкаў некаторых беларускіх свецкіх дзеячаў у справе вяртання беларускіх епіскапаў з РЗПЦ. Памёр ён у лютым 1948 году ў Мюнхене ў выніку цяжкіх цялесных пашкоджанняў, пасля таго як быў скінуты з лесвіцы каля сваёй кватэры. Паводле беларускіх эміграцыйных колаў забойства архіепіскапа Аляксандра было арганізаванае агентамі савецкіх спецслужбаў у Нямеччыне — А. В.], яны звярнуліся да епіскапаў Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і там знайшлі прыхільнасць мітрапаліта УАПЦ Палікарпа (Сікорскага), таксама члена епіскапату ПАПЦ у міжваенны перыяд, які быў кананічны, бо атрымаў усе хіратоніі ад мітрапаліта варшаўскага Дыянісія; беларускія свецкія эмігранты шукалі такога першастаяцеля БАПЦ, каб яна была кананічнай. І знайшлі ў асобе архіепіскапа Сергія [Рыгор Ахатэнка — А. В.], які быў членам Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і які быў сапраўды кананічны і вельмі хутка згадзіўся стаць галавой БАПЦ. Безумоўна, яго актыўнасць была выдатная, ужо 5 чэрвеня 1948 года ў Канстанцы, у Заходняй Нямеччыне [на граніцы са Швейцарыяй — А. В.], адбыўся беларускі сабор і з'езд Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, дзе было сказана, што БАПЦ мае доўгія традыцыі, бо з часу мітрапаліта Мельхіседэка [у 1922-1925 мітрапаліт мінскі і беларускі, выступаў за аўтакефалію заміж аўтаноміі беларускай царквы — А. В.] з 1922 года і што таксама пастановы сабора з 1942 года астаюцца актуальнымі, таму што за ваенны час немагчыма было паінфармаваць пра гэта іншых кананічных цэркваў.

Сергій пачаў сваю актыўную дзейнасць і неўзабаве знайшоў нашага земляка з Дублян каля Беластока Уладзіміра Тамашчыка, які [хіратанізаваны епіскапамі УАПЦ — А. В.] прыняў імя Васіля і стаў епіскапам БАПЦ. Васіль зараз адкрыў у Рэгенсбургу новы прыход і аддзел духоўнай акадэміі ў Нямеччыне, паехаў у Англію і там таксама паставіў на прыходы святароў, пасля накіраваў у Лювэн Яўгена Смаршчка, які меў адцягнуць беларускую моладзь ад тамашняй каталіцкай місіі. У 1951 годзе Васіль паехаў у ЗША, адкрыў там некалькі прыходаў, пачаў царкоўнае будаўніцтва. У той час архіепіскап Сергій выехаў у Аўстралію, адкрываючы прыходы ў Сіднеі, Адэлайдзе, Мельбурне і шматлікіх іншых месцах. Яны стварылі дзве беларускія епархіі — у Паўночнай Амерыцы і Аўстраліі,

прычым амерыканская епархія, кіраваная епіскапам Васілём, вельмі хутка пашыралася, паўсталі новыя прыходы, напр. у Кліўлендзе, прыехала туды шмат святароў. Аляксандр Крыт, дзякуючы дапамозе епіскапа Васіля, стварыў таксама шмат новых прыходаў у Англіі — Лондан, Гамільтан, Солсберы і іншыя. Былі адкрыты беларускія прыходы ў Бірмінгеме, брацтвы ў Кембрыджы і Манчэстэры — усё гэта дзейнічала вельмі актыўна.

Найбольшы росквіт БАПЦ выпаў на 1968-1970 гады, калі беларуская дыяспара мела аж чатырох епіскапаў. Архімандрыт Мікалай стаў епіскапам у Таронта, а архімандрыт Андрэй (Аляксандр Крыцкі) стаў памочнікам епіскапа Васіля ў Нью-Йорку. Вось пабачым, якое было змаганне ў беларускай царкве за кананічнасць, якая дыскусія, каторая з цэркваў сапраўдная, і як яна павінна адносіцца да іншых цэркваў.

Вядомы епіскап Афанасій (Антон Мартос), які напісаў шмат матэрыялаў пра гісторыю Праваслаўнай царквы ў Беларусі, звяртае ўвагу, што сапраўдным праваслаўным мітрапалітам з'яўляецца мітрапаліт Панцялейман [Павел Ражноўскі, які ў 1922 годзе не прызнаў польскай праваслаўнай аўтакефаліі, у 1941 годзе заснаваў Беларускую мітраполію і стаў яе мітрапалітам, у 1944 годзе выехаў у Германію, дзе далучыўся да РЗПЦ — А. В.], які працягвае традыцыю Беларускай праваслаўнай царквы. Той жа Афанасій, які быў членам Рускай праваслаўнай зарубежнай царквы, сказаў, што беларускія епіскапы павінны чакаць адпаведнага моманту, калі Беларусь стане незалежнай, тады вярнуць ідэю Беларускай аўтакефальнай царквы, закончыць сабор з 1942 года і на чужыне заснаваць аўтакефальную Беларускую царкву з кананічным епіскапатам. Крытыкаваў ён усіх тых епіскапаў, якія былі высвячаны ва Украінскай аўтакефальнай царкве, крытыкаваў таксама ўсіх дзеячаў крывіцкага руху, абвінавачваў іх у тым, што яны нічога добрага не робяць, але наадварот, уводзяць царкоўны раскол. Вінаваціў ён розныя свецкія асобы, напрыклад, вядомага Аляксандра Русака [у час нямецкай акупацыі бурмістра Баранавіч — А. В.] ці мітрапаліта Палікарпа, і напісаў, што гэтым усім падзелам віноўны ўкраінскі епіскапат ды дыверсія НКВД, якое ўвесь час толькі дзеліць беларускае асяроддзе.

З гэтых палемік вынікае, што беларуская эміграцыя была выдатна падзелена ў сваіх ацэнках. І тыя нават, што былі за аўтакефаліяй беларускай царквы, сумняваліся наконт яе кананічнасці А дарэчы было так, што тых чатырох беларускіх епіскапаў, якія былі ў Амерыцы і Аўстраліі і якія былі кананічна прыняты сербамі, украінцамі, грэкамі, трымаліся кананічнай еднасці; яны разам служылі, яны кантактаваліся. У 1961 годзе ў Амерыцы была ўзаконена Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква і гэты факт пацвердзіў экзарх усяленскага патрыярха, што беларуская царква ў руках архіепіскапа Васіля.

З другога боку, Беларуская цэнтральная рада напісала вялікую заяву, што беларусы павінны трымацца ідэі беларускай аўтакефаліі, ідэі беларускай царквы, трымаючыся прытым кананічных рашэнняў. У канцы канцоў, наступныя падзелы, якія наступілі ў беларускім рэлігійным праваслаўным руху мелі яшчэ іншую прычыну. У 1970 годзе памёр у Нью-Йорку архіепіскап Васіль. Пазней, у 1971 годзе памёр у Адэлайдзе архіепіскап Сергій. Асталіся архіепіскап Андрэй і епіскап Мікалай. Яшчэ раней дайшло да вялікага канфлікту паміж архіепіскапам Васілём і духавенствам па кананічных і прэстыжных прычынах, дайшло да судоў. Выкарысталі гэта дзеячы крывіцкага руху, якія паставілі шмат закідаў. У цэлай беларускай эміграцыйнай прэсе падняўся вялікі шум. У гэтыя спрэчкі ўключыўся і канадскі епіскап Мікалай, ён нават паспрачаўся з епіскапам Андрэем, дайшло да афіцыйнага падзелу: сабор з епіскапам Андрэем выключыў з царквы архіепіскапа Мікалая, а Мікалай зрабіў дакладна тое самае з архіепіскапам Андрэем. Частка людзей, якія ўжо не маглі на гэта глядзець, вырашыла, што няма іншага выхаду, як падацца ў Грэчаскую кананічную царкву, у Канстанцінопаль, там быў архіепіскап Якавас, і ён некалькі прыходаў прыняў у сваю юрысдыкцыю. У тым часе ў Чыкага была дзіўная спроба стварыць паралельную беларускую царкоўную аўтакефалію. Там нейкі архіепіскап Украінскай царквы Мікалай высвяціў двух епіскапаў, але што з імі сталася — невядома...

Канфлікты між епіскапамі давялі да таго, што яны ахапілі ўсю беларускую эміграцыю. Нават смерць епіскапа Андрэя ў 1983 годзе нічога не змяніла. Выбралі новага архіепіскапа Ізяслава, які працягваў ваяваць з Мікалаем, які сам сябе прызначыў мітрапалітам. 35 гадоў гэтай барацьбы закончылася тым, што большая частка прыходаў пасля смерці і Ізяслава, і мітрапаліта Мікалая пайшла пад юрысдыкцыю грэкаў. Засталося восем прыходаў, заснаваных падчас стварэння БАПЦ, якімі ад 2006 года загадвае архіепіскап Ёван, чарнагорац, які па-беларуску не гаворыць, але кіруе беларускай царквой; мае ён сваё бюро ў Кіеве.

**Апрацаваў Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

# Свята паэзіі ў Гародні

**У часы восеньскай слоты, што не спяшаецца саступіць месца каляндарнай, законнай зіме, асабліва неабходная душэўная акавіта, што не дасць змарнець жыццёвым сілам. І гэта цудоўна, калі прыгожае святло ў людскіх сэрцах запальваецца дзякуючы паэзіі, Слову, што гучыць, што пераствараецца ў мноствах сэнсаў праз успрыняцце ў залежнасці ад жыццёвага досведу, ад умення слухаць і чуць.**

Менавіта такое свята паэзіі падаравалі нам беластоцкія паэты Ян Чыквін, кіраўнік Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" і Галіна Тварановіч, што завіталі ў Гародню дзесятага снежня. Белавежцы, на жаль, не частыя госці ў горадзе над Нёманам, бо ўсё яшчэ межы надзейна адгароджваюць нашы месты, бо ўсё яшчэ актуальна напісанае гарадзенскай паэткай Данутай Бічэль многа гадоў таму:

*Між суседак-краін не заўсёды ўсё гладка.*
*Прагавітасць да ўлады — то мір, то вайна.*
*Тут граніца зыбалася, бы дашчаная кладка.*
*Ды любоў і нянавісць у сяброў тут адна.*

Ян Чыквін з кагорты тых паэтаў, што абралі шлях слугавання Красе ў яе разнастайных праявах. Шлях, што запачаткаваны ў нашым прыгожым пісьменстве сто гадоў таму Максімам Багдановічам. Невыпадкова творчасць гэтага паэта асабліва шануецца Янам Чыквіным. Таму першым акордам вечарыны і стала песня „Панад белым пухам вішняў..." на верш класіка ў далікатна-прыгожым выкананні студэнткі Насці Саковіч.

*Ала Петрушкевіч і Ян Чыквін*

Вершы маюць свой лёс. Між тых, якім пашанцавала, „Даўно нежывы бацька полем ідзе...". Мяркую, варта нагадаць яго:

*Даўно нежывы бацька полем ідзе.*
*Ён арэ.*
*Ён і плуг. Ён і скіба раллі, і зерне,*
*І водсвет далёкага раю.*
*Вочы, якімі ён глядзіць на свет,*
*Тыя самыя вочы, што яго сузіраюць.*
*Аўсу бацька ўзяў у радно*
*Ды сее той бок, дзе вечнасць даўно.*

Верш Яна Чыквіна, якому аддадзена хіба найбольш увагі з усіх, напісаных паэтам. Надзвычай цікавае эсэ „Безназоўны верш Яна Чыквіна" паводле гэтага твора напісаў паэт Алесь Разанаў, які цікава разважае над тым, чаму твор, дзе столькі знакавых назваў-назоўнікаў, застаўся „безназоўным". Выснова гэткая ж арыгінальная, як і роздумы: „Безназоўны" верш Яна Чыквіна прыводзіць нас да разумення істоты пытання, не задаючы пытання, і да прадчування істоты адказу, не даючы адказу". Перастворaны на чатыры мовы: польскую, нямецкую, італьянскую, французскую, пры гэтым пераклад па-французску быў неспадзеўкай і для самога Яна Чыквіна, і для зацікаўленых слухачоў. Ён быў прачытаны ўпершыню. Верш перастварыла маладая гарадзенская паэтка Ганна Аўчыннікава, аўтару быў падараваны аўтограф. Як хораша прагучала гэтае шматмоўнае паэтычнае суквецце ў выкананні юных філалагіняў!

Вечныя пытанні пра пачатак пачаткаў, вечная нязгода праўдалюбцы, вольнага птаха з выгодамі „падкантрольнага раю", вечныя шляхі-дарогі вандроўніка-мужчыны ў пошуках адказаў і вечнае чаканне жанчыны, маці, каханай, сястры, — усё гэта прываблівае ў вершы Яна Чыквіна „Размова з сястрой", што быў прачытаны па ролях.

Ян Чыквін вядомы як даследчык літаратуры, аўтар многіх манаграфій. Асаблівы ўклад зрабіў ён у адкрыцці беларускага замежжа, вяртанні творцаў, незаслужана забытых на Беларусі. Артыкулы з ягонай кнігі „Далёкія і блізкія. Беларускія пісьменнікі замежжа" прысвечаныя знакавым імёнам: Наталля Арсеннева, Масей Сяднёў, Ларыса Геніюш... Гэтыя працы хораша ўспрымаюцца студэнтамі, знаходзяць водгук у юных літаратуразнаўцаў. Так, Юлія Пышынская стварыла сапраўднае эсэ, якое з увагай было ўспрынята і аўтарам, і прысутнымі, паводле артыкула Яна Чыквіна „Зэльвенская непаслушніца" пра творчасць Ларысы Геніюш. Імя яе было ўзгадана яшчэ таму, што 2010 год юбілейны: спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння вялікай паэткі.

Але самае цікавае, кульмінацыя імпрэзы — слова паэта. Яно то ператвaралася ў сур'ёзную развагу знанага літаратуразнаўцы пра вытокі паэзіі, пра знакавыя постаці айчыннага пісьменства, то гучала як філасофскі трактат, развагі пра адвечныя пытанні быцця, то было напоўнена дасціпным гумарам, што выклікала ў слухачоў адпаведную рэакцыю. І, безумоўна, тое, што чакалася найбольш: вершы ў выкананні аўтара. Асаблівага шарму чытанню гэтага паэта дадае тое, што Ян Чыквін вельмі падобны да сваіх вершаў: гэткі ж удумліва-стрыманы, далікатна-шляхетны, нешматслоўны, калі кожнае слова не проста прамаўляецца, а вяшчае, гучыць выразна, арыстакратычна. Такое супадзенне маем далёка не заўсёды. Паэт прапанаваў вершы са свайго апошняга па часе паэтычнага зборніка „Жменя пяску". Зрэшты, ужо не апошняга, бо паэт з'явіўся на сустрэчу з шыкоўным падарункам літаральна для ўсіх прысутных — кнігай выбраных твораў „Адно жыццё", якая літаральна напярэдадні выйшла з друку. Выдадзеная грунтоўна і густоўна, гэтая кніга ўспрымаецца як падвядзенне вынікаў амаль саракагадовай творчасці. Адно жыццё ў паэзіі.

**Ала ПЕТРУШКЕВІЧ**

Сярод мноства музеяў у Беларусі, якія створаны дзеля захавання гістарычнай спадчыны, працуе ўстанова, якая па сваёй назве мусіць быць месцам, дзе гэтая спадчына захоўваецца ў найбольшай ступені. Гэта — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на гучную назву, музей не надта вядомы шырокай грамадскасці. Магчыма, гэта таму, што такая назва была нададзена яму толькі ўвосень 2009 года. Да таго ён называўся Нацыянальным музеем гісторыі і культуры, а яшчэ раней, да 1992 года — Дзяржаўным музеем БССР.

Каб набыць уяўленне аб музеі, варта зазірнуць на ягоны сайт, што месціцца па адрасе **http://history.museum.by**. Першае, што кідаецца ў вочы з галоўнай старонкі, гэта абсалютнае непадабенства на сайты іншых музеяў.

На сайце гістрычнага музея няма ніякіх аздабленняў і ўпрыгожанняў. Спярша прыходзіць думка, што сайт увогуле не існуе, а пастаўлена толькі нейкая загатоўка, якой, верагодна, толькі наканавана ў будучым стаць сайтам. Праўда, такая думка развейваецца, калі звярнеш погляд на рубрыкі, выйсці на якія пададзены зверху, а таксама на назвы мерапрыемстваў, што адначасова з'яўляюцца выйсцямі да расповедаў аб гэтых мерапрыемствах.

Толькі „зайшоўшы" на вышэйзгаданыя расповеды можна пабачыць выявы розных мастацкіх карцін, скульптур і фотаздымкаў з імпрэз.

Працягам, па сутнасці, галоўнай старонкі з'яўляецца рубрыка „Навіны". Адно адрозненне тут — невялікія анатацыі да згаданых мерапрыемстваў, якія праводзяцца пад эгідай Нацыянальнага гістарычнага музея.

Найбольш насычанай інфармацыяй падаецца старонка „Музей". Тут распавядаецца аб гісторыі стварэння гэтай установы, яе развіцці і сучасным існаванні.

„У 1906 г. быў прыняты закон, які даваў губернскім уладам права зацвярджаць статуты новых недзяржаўных устаноў, што прывяло да ўзнікнення ў гарадах архіўных камісій, таварыстваў аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Царкоўна-археалагічныя таварыствы існавалі ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі. У прыватнасці, у Мінску царкоўна-археалагічны камітэт быў утвораны ў 1908 г. Па яго ініцыятыве і ў сувязі з правядзеннем мерапрыемстваў, прысвечаных 300-годдзю смерці князя Канстанціна Астрожскага, у тым самым годзе быў адкрыты Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны музей, які займаўся зборам царкоўных старажытнасцей", — такім быў пачатак Нацыянальнага гістарычнага музея.

Сёння музей валодае трыма будынкамі ў Мінску. Сярод іх — дом-музей першага з'езда Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, з якой у рэшце рэшт вырасла амаль усемагутная некалі Камуністычная партыя Савецкага Саюза. На сайце падаецца карта з абазначэннямі гэтых будынкаў. Каб яе пабачыць, трэба зайсці на старонку „Кантакты".

Нягледзячы на сціпласць сайта, супрацоўнікі музея вядуць даволі актыўную дзейнасць. Прынамсі, яны прапануюць наведвальнікам такія паслугі як лекцыі, экскурсіі, правядзенне выязных мерапрыемстваў і музейна-педагагічных заняткаў. Больш дэтальна пра гэта распавядаецца на старонцы „Наведвальнікам".

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

**Студзень пад знакам фрыстайла**

Спартовы год імкліва пакаціўся ў часе і вось ужо пара падсумоўваць дасягненні беларускіх атлетаў у студзені.

**1. Антон Кушнір** (фрыстайл) выйграў адразу некалькі медалёў Кубка свету (срэбра ў канадскім Калгары, золата ў амерыканскіх Дзір-Вэлі і Лэйк-Плэсідзе, канадскім Мон-Габрыелі) і перамог у агульным заліку, здабыўшы Крыштальны глобус. Застаецца напярэдадні алімпіяды пастукаць па дрэве.

**2. Аляксей Грышын, Дзмітры Дашчынскі** (фрыстайл). Прызёры мінулых алімпіяд адзначыліся бронзай на розных этапах — першы ў Калгары, другі ў Дзір-Вэлі.

**3. Аляксандр Буйкевіч** (фехтаванне) на першым жа этапе Кубка свету ў Стамбуле ўзяў бронзу ў спаборы шаблістаў. Застаецца пажадаць яму стабільнасці, якой часцяком бракуе.

**4. Цімох Слівец** (фрыстайл) у агульным заліку генеральнай класіфікацыі ідзе на 4-м месцы. Кожны з нашых лыжных акрабатаў здольны на самыя высокія пазіцыі.

**5. Андрэй Міхневіч** (штурханне ядра) выйграў Кубак Беларусі, паказаўшы другі вынік сусветнага сезона — 21 м 30 см.

**6. Эдуард Міхан** (дзесяцібор'е) на чэмпіянаце краіны па шматбор'і, што прайшоў у Магілёве, перамог, нягледзячы на канкурэнцыю больш дасведчаных сапернікаў.

**1. Вікторыя Азаранка** (вялікі тэніс) на Australian Open дайшла да чвэрцьфіналу адзіночнага разраду, дзе ў драматычным змаганні саступіла будучай пераможцы турніру. Тым не менш Азаранка стала на сёння ўжо шостай ракеткай свету.

**2. Асоль Слівец** (фрыстайл) у агульным заліку Кубка свету ўваходзіць у васьмёрку мацнейшых. Пасля працяглага перапынку ў выступах гэта безумоўна абнадзейвае. На яе рахунку бронза Мон-Габрыеля.

**3. Вікторыя і Вераніка Паўловіч** (настольны тэніс) трапілі ў прызёркі адкрытага чэмпіянату Славеніі. Вікторыя ў пары са Святланай Ганінай з Расіі сталі пераможцамі, а Вераніка дасягнула бронзы ў адзіночным разрадзе.

**4. Дар'я Домрачава** (біятлон) адзіная з беларускай зборнай уваходзіць у дзесятку лепшых у агульным заліку Кубка свету. У прызёры яна не трапіла, але ў нямецкім Рупольдынгу была 4-й у спрынтарскай гонцы, толькі 6 секунд адстаўшы ад бронзавай прызёркі.

**5. Яна Максімава** (пяцібор'е) стала пераможцай першынства краіны ў такім складаным і універсальным відзе. Застаецца праектаваць такія поспехі на міжнародную арэну.

**6. Наталля Ануфрыенка** (баскетбол) у складзе свайго клуба „Дунаў" стала ўладальніцай Кубка Балгарыі. Абаронца нацыянальнай зборнай Беларусі зрабіла важкі ўнёсак у заваёву і была адзначана персанальным прызам як лепшая асістэнтка.

З жаночых калектываў вылучым валейбольную „Мінчанку", якая адзіная з беларускіх клубаў здолела выйсці ў 1/8-ю еўрапейскага Кубка выкліку. Каманда Алега Гулевіча ў 1/16-й адолела кіпрскі АЕЛ і зараз паспяхова змагаецца ў двухраўндавай дуэлі з клубам „Сала" (Фінляндыя). Першы матч нашы дзяўчаты выйгралі 3:0.

У мужчын сапраўднае фіяска пацярпела гандбольная зборная, якая на першым этапе адборавага турніру да чэмпіянату свету саступіла нават Кіпру і стала толькі трэцяй у квартэце. Баскетбольны „Мінск-2006" здолеў апярэдзіць у „Еўрачэленджы" каманду „Амстэрдам" і заняць 3-е месца ў групе. Дэбютант еўрапейскага чэмпіянату па міні-футболе зборная Беларусі была блізкая да чвэрцьфіналу першынства.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

*„Я чалавек шчаслівы, упарты і рашучы...”*

# Ці лёгка сказаць

Уладзімір Саўчук, родам з Кузавы пад Чаромхай, належыць да сярэдняга (нар. у 1956 г.) пакалення пісьменнікаў-„белавежцаў”. Гэты сціплы і разважлівы сем’янін, па адукацыі тэхнік-энегретык, руплівы і сумленны працаўнік, выдаў ужо чатыры кнігі лірыкі: дзве кнігі па-беларуску і дзве па-польску. Польскамоўныя ягоны выданні курыраваў вядомы паэт родам з Лубнік пад Заблудавам Ян Леанчук. Ён і даў пасляслоўе да найноўшага, чацвёртага выдання Саўчука — „Łatwo powiedzieć”. Ну зусім так *лёгка сказаць* пра тое ўсё, пра што раздумвае паэт, бо тыя словы — правакацыя, хоць сам Уладзімір Саўчук не правакатар і не наватар. Леанчук: „Чарговая паэтычная прапанова Уладзіміра Саўчука дазваляе думаць, што для аўтара наступіў найлепшы час, каб перадаць свой унутраны зрух і раз за разам паказваць, нічым не абмежаванае, задзіўленне над светам. Тым больш, што ў спелым веку тыя найбольш аўтэнтычныя адчуванні найчасцей глыбока хаваюцца. У найнавейшых вершах аўтэнтычнасць успрыняцця абагачана ўнутраным рытмам. Адшукванне хваляванняў дзяцінства дазваляе таксама на ўвядзенне (бачнай ужо ў ранейшых вершах) рытмікі народных запеваў. Краявід, маляваны да гэтага часу пяром паэта, дакладна адлюстроўваў этнаграфічны вобраз вёскі, якой ужо няма; цяпер да яго далучыўся таямнічы прысмак настальгіі, лірычных напеваў, і бачым застылы свет у поўні колераў. Застаецца Уладзімір Саўчук верным сваёй зямлі і яе дыханню. Гэта важнае паэту — знайсці пупавіну, якой былі вобразы ўкалыханыя дзяцінствам, мову, у якой паэт знаходзіў такія блізкія яго сэрцу краявіды, нават сны з гарадскіх блёкавішчаў, якія снуюцца па бацькаўшчыне. Уражлівасць паэта збірае гэтыя элементы і вось маем хвалюючы вобраз «вяртанняў памяці»”.

Ставіць аўтар пытанні пра праўду, дэмакратыю, любоў, веру, надзею, пытанні да Бога, людзей і самога сябе... Адказы простыя. „Паверце!” — *Калі людзі кахаюцца — квітнее жыццё, хоць у штодзённыя справункі загнаў нас лёс, ёсць сям’я, цесная кватэра, шмат цяпла — найважнейшае, што расцвітае веры голас. Бо каханне апранае ўсіх нас, а мары здзяйсняюцца, калі ў дарослы ўвойдзеш час. Не зачыняй свае веры ў чатырох сценах... (...) Бо каханне, каханне навучыла ўсіх нас: вера чыніць цуды таму, хто пераадолеў грэху час.* Адказы простыя. І зноў пытанні, дзе адказ не такі просты. Бо *найбольшую мару маладосці рассеяў вецер паміж Чаромхай і Беластокам.*

Перапоўнены пачуццём пэўнай місіі — запісаць момант маладосці і сталасці сваёй і сваёй малой айчыны, аўтар раз упэўнены, што ўлавіў ужо сутнасць існавання, іншы раз агортвае яго няўпэўненасць. Явіцца яму нават анёл Гаўрыіл: *прысеў і ўгаворвае мяне, што тут маё апірышча*, пасля зноў ламаецца: *не адмяню мышлення; час падрэзвае крылы, маршыруюць успаміны, маладосць гаіцца, хачу падняць веды вышэй за людскія сілы...* Што ж, паэтам быць — усё думаць, думаць, як сказаў іншы паэт, і не спаць па начах, і змагацца, і ставіць пытанні, і падаць пад адказамі або знемагаць ад таго, што адказаў не знайсці... Ці гэта шчасце, ці не?.. „Я шчаслівы муж і бацька двух сыноў!” — з гонарам кажа паэт. — *Пісанне вершаў з’яўляецца маім захапленнем і марай, якая здзяйснілася выданнем гэтых кніг. Я чалавек шчаслівы, упарты і рашучы.* Відаць, тое двухаблічча дае плён. У гэты раз у выглядзе вельмі прыгожай кнігі — на рэдкасць таксама пекнай і звонку. Проста, хочацца яе крануць, пагартаць. Ужо ад самой вокладкі (яе праектаваў сам аўтар) б’е цяпло, як ад жывога сэрца добрага чалавека.

**Міра ЛУКША**

Włodzimierz Sawczuk, *Łatwo powiedzieć*, Białystok 2009, ss. 81.

# Навагодні баль у музеі

Фота Тамаша ЦІХАНЮКА

Фота Тамаша ЦІХАНЮКА

Скончыліся навагоднія святкаванні, неад’емнай часткай якіх з’яўляюцца ладжаныя ў нашым асяроддзі навагоднія балі ў другім тэрміне, паводле юліянскага календара. Раней мелі яны не толькі забаўляльны, але і інтэграцыйны характар. Ладзілі іх не толькі на Беласточчыне — найгучнейшы баль адбываўся ў Палацы культуры і навукі ў Варшаве, куды з’язджаліся беларусы з усёй Польшчы. А як выглядаюць навагоднія балі цяпер, калі ладзяць іх шматлікія арганізацыі, установы і рэстараны? З такім пытаннем я звярнуўся да Тамаша Ціханюка — аніматара культуры ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы.

Фота Тамаша ЦІХАНЮКА

— У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы навагодні баль адбыўся 13 студзеня. Прыняло ў ім удзел некалькі дзесяткаў асоб з Гайнаўкі, Рудутаў, Вэрстока, Бандароў. Сабраныя гулялі пад музыку гайнаўскага гурту „Кантрольны вобраз”. Гэты калектыў выступаў у нас на балі ўжо другі раз і ён вельмі папулярны сярод удзельнікаў балю. Большасць яго рэпертуару складаюць вядомыя ў нас песні. Апрача танцаў і песень былі калядкі і феерверкі. Традыцыйна апоўначы — пасля навагодніх тостаў і бакала шампанскага — пачалася ноч музея: наведванне музейных экспазіцый. Удзельнікі балю ахвотна пакарысталіся магчымасцю пазнаёміцца з выставамі. Такім чынам баль набыў таксама і адукацыйны характар. Навагодняя сустрэча аказалася ўдалым мерапрыемствам, хаця вельмі шкада, што не прынялі ў ім удзелу настаўнікі беларускай мовы і астатнія працаўнікі мясцовага беларускага ліцэя.

На балі не паказаўся ніхто з улад горада і гарадскіх радных, дзесьці прапалі ўдзельнікі хору „Рэха пушчы” і дзеячы Павятовага аддзеда БГКТ у Гайнаўцы. Відаць, неабходная ім душэўная рэанімацыя.

**Віктар БУРА**

## СПАЧУВАННІ

Калектыў Беларускай службы Польскага радыё выказвае спачуванні нашаму калегу, былому працаўніку рэдакцыі

**Яраславу Іванюку**

па прычыне смерці Бацькі. Дарагі Яраслаў! Пайшоў з жыцця блізкі табе чалавек — ТАТА. Разумеем, што значыць страціць любімага чалавека, раздзяляем Твой боль і смутак у цяжкія для Цябе хвіліны.

**Беларуская служба Польскага радыё, Варшава**

# Адгаданка

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| | | | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |

**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — італьянскую пагаворку.

1. жонка Адама = 4 _ 3 _ 18 _;
2. германскі порт, сталіца Шлезвіг-Гольштэйна = 10 _ 2 _ 1 _ 6 _;
3. імя Панчанкі = 12 _ 16 _ 15 _ 19 _ 17 _;
4. перамяшчэнне = 13 _ 8 _ 7 _;
5. возера ў Эфіопіі = 9 _ 11 _ 5 _ 14 _.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 1 нумара**

Ярд, Арол, парашок, шэрсць, прычт, чабан, Ловаць, рыза.

Рашэнне: **Дабро шэпча, зло крычыць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 250 egz.

# Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (11)

Ганна КАНДРАЦЮК

**Які самы вабны экспанат у гарошкаўскай хаце-музеі? Спачатку мы думалі пра чыгунок, у якім паэт згатаваў легендарны крупнік з рыбіны. Мы ведалі, што беларускі турыст хутчэй чым кніжнай сценкай, на якой красуюцца айчынная паэзія і драмы, пацікавіцца кулінарыяй. Апошняя прапанова, хоць прасякнутая творчым палётам і каштоўная ў рынкавым сэнсе, падалася паўсюднай і таму недастаткова годнай асобы паэта.**

— Тут трэба такое, якога яшчэ нідзе не было, няма і не будзе, — сказала Міра Лукша.

— Ну і каб яно натхняла, аздараўляла і прадказвала будучае, — падбіла я стаўку. Беларускі народ практычны, ён цэніць адно носьбітаў культуры здольных наклікаць цуд. Пра паэтаў, якія пішуць вершы і не наклікаюць цудаў, наш чалавек прыдумаў не менш гладкапрыкольны вершык: *Не той паэт, хто піша вершы — а той паэт, хто вып'е першы!*

Так ці інакш, мы знайшлі дастаткова прыцягальны і намагнічаны экспанат у Гарошкаве. Адказ прыйшоў двое сутак пасля выезду з Гарошкава, на вакзале ў Слоніме, далёка за поўнач, дзе з вечара да ранняя мы чакалі аўтобуса ў Жыровічы. Здарожаныя і засаджаныя ў цесныя крэслы з жалезнымі парэнчамі, з-за якіх не было як след прылегчы, мы марылі пра адно: пра цёплы ложак з пасцелькай.

* * *

Думкі пра ложак і пасцель не давалі нам спакою ад пачатку нашага дзядоўскага турнэ. Ужо ў начным цягніку Гродна — Гомель Віктар К., аднапляменец з беларускага боку Белавежскай пушчы, папракнуў нас у недастаковым веданні спраў ложка. Ён далікатна пакрытыкаваў маю недастаткова гладка пасланую койку, раскінуў пасцель і паслаў як належыць, значыць, без адной маршчынкі, аздобіў яе падбітай як пышны пампушак падушкай і запрасіў спачываць (а сам выйшаў на калідор і пачакаў аж залезем пад коўдры). Паколькі Віктар напамінаў майго сваяка-брата, яго жэст прамовіў як добрая рада ў пэўных далікатных справах. Добра пасланы ложак не проста мэбля, ён гарантуе поспех і дзейнічае як... Менавіта як унушальна, творча і дыдактычна дзейнічае адпаведна пасланы ложак я зразумела ў Гарошкаве. Калі мы з раднёй паэта селі за стол вячэраць, я крадком спазірала на стары жалезны ложак са здобнымі шчыткамі. Мэбля стаяла сабе ля сцяны, дакранаючы белы прыпечак печы з выявай сэрца. Унізе, з-за зялёна-аранжавай плюшавай радзюжкі, выглядалі старыя боты. Але мяне расчуліў спосаб, у які жанчыны паслалі ложак. Праз момант мне здалося, што я ў сваёй падляшскай вёсцы. Той цёплы і родны вобраз наклікалі не боты пад ложкам, а дзве звычайныя падушкі ў палатняных навалачках, якіх тут паклалі адна на адну і палажылі на пасланні, ля шчытка, ва ўзгалоўі. Падушкі пасылалі свой сакрэтны камунікат; яны не толькі заахвочвалі прылегчы і адпачыць, але вызначалі напрамак, у якім трэба ўкласці голаў да сну. Падобную паслядоўнасць мы прыкмецілі на вясковым могільніку, дзе большасць пакойнікаў пахавана галавой да ўсходу сонца.

* * *

У хатцы-музеі сустрэнем яшчэ адзін ложак, праўда, ён, як сапраўдны скарб, прыхаваны ад вачэй і людской зайздрасці. Калі хто пераступіць парог музея, мала хто зверне ўвагу на карычневую канапу-раскладушку. Яна настолькі звычайная, што аж непрыкметная. Але мала хто ведае, што следам сціплай мэблі цягнецца матывіруючая легенда. Сам Анатоль прыздобіў свой ложак цудоўнай і лячэбнай гісторыяй. Аж няраз пашкадаваў сам сябе, бо з-за тае славы паэт быў вымушаны спаць на падлозе або шукаць начлегу па людзях. Цяжка сказаць, хто першы выпрабаваў цудоўнае аздараўленне на канапе Анатоля Сыса. З часам ягоная мэбля займела славу ў Маскве, Вільні і нават у Беластоку. Мы ўжо пісалі з якім жарам Анатоль заклікаў пісаць беларускія вершыкі айчынную інтэлігенцыю. З падобным жарам ён заклікаў сваіх сяброў і сяброўак нараджаць дзяцей. У апошняй творчасці мела спрыяць яго асабістая канапа. Дастаткова да яе дакрануцца, каб пасля дзевяці месяцаў у сям'і нарадзілася дзіцятка. Кантакт з мэбляй, пра што інфармуюць сталічныя блогі, неверагодна падтрымаў у колькасным сэнсе беларускую ідэю. З яе дапамогай нараджалі нават пастарэлыя дзеўкі і бясплодныя пары. Сам Анатоль вельмі адказна ставіўся да сваёй місіі, калі, дзякуючы ягонай канапе, нараджала сяброўка з-пад знака *сінгл*, ён высакародна прапанаваў ёй усынавіць паўсіротку.

(*працяг будзе*)

Фота Міры ЛУКШЫ

*У хаце-музеі ў Гарошкаве*

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

*Помнік байцу, месца, куды любіў прыходзіць паэт*

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

*Скульптар Павел Лук пазначыў дом-музей мемарыяльнай дошкай*

# 07.02 — 13.02

**(22.03. — 20.04.)** Да 9.02. справішся з недаробкамі. Свабодны час прызнач на падарожжы. Арыентуйся на супрацоўніцтва, а не саперніцтва. У пачуццях мноства неспадзяванак — каб зрабіць крок наперад, мусіш адысціся назад. Хтосьці хоча зашкодзіць тваім інтарэсам.

**(21.04. — 21.05.)** Смела зрэалізуеш свае мары. Пры нагодзе падтрымаеш на духу іншых. 11 лютага твая планета Венера пераходзіць у прыязны табе знак Рыб. Але 11-14.02. можаш парвацца на штосьці, што пяройдзе твае магчымасці або чаканні.

**(22.05. — 22.06.)** Усё раскрунецца з 10.02., адкрыешся на новыя магчымасці, шмат спраў убачыш у новым святле, атрымаеш каштоўныя інфармацыі; вырашыш пару ключавых спраў. З 11.02. (да 15.02.) з чуццём будзеш рабіць інтарэсы, выдаваць грошы. Не паверыш у балбатню.

**(23.06. — 23.07.)** Мноства заняткаў. Трымайся плана, спраўся з самым важным. У „валянцінкі" чакае цябе мілая неспадзяванка. Шукаючы новых вырашэнняў, знойдзеш штосьці, што цябе проста захопіць. Калі ў цябе ёсць саюзнік, не мусіш нічога баяцца. З 13.02. пачнецца добры час у фінансах.

**(24.07. — 23.08.)** Не прастынь; вельмі пільнуй здароўя! Не балбачы пра свае справы. Не натужвайся пры перарабляні характару партнёра. Да 9.02. пазбягай рызыкі і не спакушай лёсу, бо могуць чакаць цябе прыкрыя паслядоўнасці. Еж усякую зеляніну.

**(24.08. — 23.09.)** Можа чакаць цябе часовы застой. Можаш не атрымаць спадзяваных грошай або атрымаеш іх на іншых умовах, чым спадзяваўся. Можа цябе заспець каханне 6-10 лютага; падумаеш, што сустрэў ідэал! Венера 11.02. можа паўплываць на тое, што з-за свайго шчырага кахання дасягнеш паўнаты шчасця.

**(24.09. — 23.10.)** У выбарах кахання не калькулюй, а проста кіруйся сэрцам. З-за высокіх патрабаванняў да сябе і іншых некаторыя палічаць цябе варыятам, а іншыя круцялём. Неабходнасць адпачынку не будзе ісці ў пары з навалам працы (10-14.02.).

**(24.10. — 22.11.)** Шмат хаосу ў пачуццёвым жыцці: раз фантастычна, іншы раз усё валіцца. 11.02. пачне папраўляцца (будзе супер ужо ў „валянцінкі"!). На працы бяры справы ў свае рукі і хутка выправі памылкі, якія здарыліся. Большыя выдаткі не прадбачваюцца.

**(23.11. — 22.12.)** Цяжка цябе заспець дома, поўная паштовая скрынка; з 11.02. спакайней. Выкарыстоўвай нават малыя магчымасці заробку і знаёмствы, якія прыдадуцца пазней. Таксама лепшаюць адносіны з блізкімі. Затое можаш паспрачацца са старэйшай асобай ці бацькам; сваёй дробязнасцю можаш кагосьці давесці да шалу!

**(23.12. — 20.01.)** З 11.02. (да 15.03.) твая развага, практычныя задумы і тактычныя дзеянні будуць тваім козырам. Знойдзеш спосаб, каб прыцягнуць да сябе як найбольш грошай. Варта пакарыстацца курсамі. Каля 10.02. з'яднаеш для сваёй асобы нават найбольшых скептыкаў і падазроных. Хваробы абмінаюць цябе здалёк.

**(21.01. — 19.02.)** Пашчасціцца табе ў пачуццях і ў матэрыяльных справах. Будзеш разгаворлівы, камунікатыўны, дасціпны найбольш каля 10.02. У інтарэсах памогуць табе шустрасць, кемлівасць і ўмеласць трапнай ацэнкі сітуацыі.

**(20.02. — 21.03.)** Яшчэ спакойна. Варта адысціся крыху ўбок ад жыццёвай гонкі. Не трымайся ўпарта сувязі, у якой няма будучыні. Рандэву запланаваныя 6-10.02. будуць вельмі экстраватыя. Можаш смяртэльна закахацца! Прыцягваеш да сябе толькі добрае. Можа быць актуальная прапанова, ад якой ты адмовіўся нейкі час таму.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960